

НАШЫ ПУНКТЫ ПРЫЦЯГНЕННЯ **5**

ТАЯМНІЧАЕ МАЙСТЭРСТВА ТРАСАЛОГІІ **6**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 КАСТРЫЧНІКА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 199 (29568)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ, першы сакратар ЦК БРСМ:**

*«У Год народнага адзінства праект «Аднаўленне святынь Беларусі» быў рэалізаваны пад слоганам «Нас аб'ядноўвае гісторыя і вера». Валанцёры руху БРСМ «Добрае сэрца» сумесна з канфесіямі Беларусі добраўпарадкавалі 341 святыню — цэрквы, касцёлы, крыніцы, помнікі і абеліскі вайсковай славы. Працоўныя акцыі накіраваны на тое, каб кансалідаваць моладзь праз духоўную супольнасць. Каб праз асабісты ўдзел у будаўніцтве, добраўпарадкаванні святынь, храмаў, праз добрыя справы моладзь атрымлівала духоўна-маральнае выхаванне. Гэта ўклад у будучыню, пасланне новым пакаленням».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Вакцыны павінны быць здабыткам усяго чалавецтва»

### Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з дырэктарам Еўрапейскага рэгіянальнага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя Хансам Клюге

**Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Хансу Клюге і кіраўніцтву Сусветнай арганізацыі аховы здароўя за абранне Беларусі членам выканкама СААЗ «у няпростым палітызаваным 2021 годзе». «Гэта сведчыць аб пэўнай незалежнасці і смеласці кіраўніцтва СААЗ. Як мне дакладвае міністр аховы здароўя, у нас ніколі не было праблем з арганізацыяй. Вы заўсёды дзяліліся ведамі, падказвалі не толькі ў пытаннях лячэння людзей, але і ў пытаннях набыцця пэўнага абсталявання. Увогуле, аказвалі ўсялякую падтрымку і дапамогу. Мы гэта бачым і ў часы пандэміі. Гэта дарагога варта, і мы гэта цэнім», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.**



Беларускі лідар акцэнтаваў увагу, што сітуацыя ў свеце характарызуецца ўздымам захворвання на COVID-19 і яго новага штама. І гэты ўздым адчуваецца і ў Беларусі: хвароба дасягнула таго піку, які быў раней. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што наступны тыдзень у Беларусі будзе прысвечаны таму, каб дэталёва разабрацца па кожнай бальніцы, па кожным інфіцыраваным чалавеку і прыняць дадатковыя меры, калі гэта неабходна, для лячэння людзей ад ковіду.

«Я абсалютна падтрымліваю СААЗ у тым, што нельга сёння быць індывідуалістам і эгаістам. Я маю на ўвазе краіны, якія спрабуюць зачыніцца, уводзяць лакдаўны, якія, маючы лекі, не заўсёды своечасова і ў патрэбным аб'ёме пастаўляюць іх на рынак, маючы магчымасць вырабляць сродкі індывідуальнай аховы, не заўсёды дзеляцца з іншымі краінамі. Вакцыны павінны стаць здабыткам усяго чалавецтва. Гэта інтэрнацыянальная хвароба, і калі нейкая краіна думае ізалявацца і ў гэтым плане паспытаць шчасця, нічога не атрымаецца. Трэба разам усім 7,5 мільярдам насельніцтва перадольваць гэтую хваробу. У гэтым плане я вас абсалютна падтрымліваю», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падзякаваў СААЗ за падтрымку Беларусі ў лячэнні не толькі COVID-19, але і іншых хвароб. «Не трэба забываць, што ў нас людзі хварэюць і ў значна большым аб'ёме і іншымі захворваннямі. І тут мы атрымліваем усялякую падтрымку. Я хачу, каб вы перадалі мае самыя цёплыя словы кіраўніцтву СААЗ за тую каласальную падтрымку, якую вы аказваеце па ўсім свеце, у тым ліку і Беларусі», — канстатаваў ён.

СТАР. 2

## КОРАТКА

- **Больш чым 850 пунктаў вакцынацыі супраць COVID-19 адкрыты ў Беларусі.**
- Дні культуры Беларусі ў Расіі пройдуць з 31 кастрычніка да 3 лістапада.
- **У Глыбоцкім раёне ў 2024 годзе плануюць пачаць будаўніцтва завода па перапрацоўцы торфу. Прадпрыемства будзе здабываць сыравіну і вырабляць грунты, субстраты і тарфяныя сумесі.**
- Прэзідэнт ФІФА прапанаваў правесці ЧС-2030 у Ізраілі, Палесціне і суседніх краінах.
- **Беларусь і Індыя абмяркоўваюць арганізацыю прамых авіязносін.**

ISSN 1990 — 763X

Журналіст атрымаў заданне

# ПРАКАНТРАЛЯВАЦЬ НАШЭННЕ МАСАК

### Чаму наш карэспандэнт у Віцебску прычапіўся да пакупніцы ў краме? Праўда, калі б выклікалі міліцыю, праблемы былі б не ў журналіста

**Днямі ў Беларусі ўвялі больш жорсткія патрабаванні да захоўвання супрацьэпідэмічных мер у грамадскіх месцах. Усе абавязаны насіць маскі і трымаць дыстанцыю ў крамах, аб'ектах грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання, пры наведванні тэатраў, кінатэатраў, культурна-масавых мерапрыемстваў, стадыёнаў, прадпрыемстваў, устаноў аховы здароўя, аптэк і іншых аб'ектаў. Адпаведныя змены ўнесены пастановай № 105 Міністэрства аховы здароўя ад 6 кастрычніка 2021 года.**

СТАР. 4



По палічках

# НЯБЕДНА ЖЫЦЬ НЕ ЗАБАРОНІШ

### Дадатковая пенсія з гарантыяй ад дзяржавы

**Сёння з'явілася яшчэ адна магчымасць забяспечыць нябедную старасць дзякуючы новаму Указу Прэзідэнта № 367 «Аб добраахвотным страхаванні дадатковай назапашвальнай пенсіі». Як скарыстацца новай праграмай, тлумачаць прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і Міністэрства фінансаў, а таксама дзяржаўнай страхавой кампаніі.**

## АБ ПЕНСІЙНАЙ СІСТЭМЕ І БУДУЧЫХ ЗМЕНАХ

Беларусь — сацыяльна арыентаваная дзяржава, у якой адзін з ключавых прыярытэтаў — клопат аб пажылых людзях і забеспячэнне годнага ўзроўню жыцця. Дзяржава прадугледжвае дадатковыя механізмы, калі чалавек можа істотна павялічваць памер сваёй пенсіі.

У краіне на сёння ёсць два такія механізмы. Адзін існуе ў рамках агульнай пенсійнай сістэмы і датычыцца тых асоб, якія ўжо дасягнулі пенсійнага ўзросту. Гэта адкладзеная пенсія, якая дазваляе чалавеку фарміраваць сабе больш высокія даходы на пострацоўны перыяд, працягваючы працаваць і на пэўны тэрмін адмовіўшыся ад атрымання пенсіі. Другі спосаб — добраахвотнае страхаванне дадатковай пенсіі ў страхавых арганізацыях. Цяпер з'явіўся яшчэ адзін спосаб палепшыць матэрыяльнае становішча пад старасць.

СТАР. 4

# «ІНТЭГРАЦЫЙНЫ ПАРАДАК ДНЯ ПРЫКМЕТНА АЖЫВІЎСЯ»

**Прэзідэнт Беларусі прыняў удзел у пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. Вітаючы ўдзельнікаў пасяджэння, кіраўнік дзяржавы выказаў спадзяванне, што па меры стабілізацыі эпідэміялагічнага становішча вернуцца традыцыйныя сустрэчы ў вочным фармаце.**

«Радуе, што да восені наш інтэграцыйны парадак дня прыкметна ажывіўся. У верасні з многімі з вас мы сустракаліся ў Душанбэ на мерапрыемствах ШАС і АДКБ, дзе асаблівую ўвагу ўдзялілі знешнепалітычным пытанням. Сёння ў нас ёсць добрая магчымасць абмеркаваць эканамічныя аспекты супрацоўніцтва», — падкрэсліў ён.

Па словах Прэзідэнта, у вузкім складзе ўдзельнікі пасяджэння абмеркавалі пытанні фарміравання агульнага рынку газу, у тым ліку яго цэнаўтварэння і транспарціроўкі. Увагу ўдзялілі мэтазгоднасці далучэння ЕАЭС да глабальнага дыялогу па клімаце і ўзгадненні праекта сумеснай заявы па гэтай тэме.

На парадку дня пасяджэння ў шырокім складзе было прыняцце аднаго з ключавых дакументаў сустрэчы — рашэння аб пераходзе да другога этапу стварэння агульных рынкаў нафты і нафтапрадуктаў. Ён прадугледжвае падрыхтоўку да 2023 года праектаў правілаў гандлю і правілаў біржавых таргоў гэтымі прадуктамі. Да 2024 года плануецца распрацаваць міжнародны дагавор аб фарміраванні агульных рынкаў.

«Пры гэтым, імкнучыся да стварэння агульнага рынку энергарэсурсаў, неабходна ўлічваць інтарэсы ўсіх дзяржаў — членаў нашага саюза. Толькі такім чынам мы зможам забяспечыць яго ўстойлівасць і даўгавечнасць», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар назваў кірункі, якія лічыць прыярытэтнымі ў інтэграцыйным будаўніцтве.

## ФАРМІРАВАННЕ ЛІЧБАВАЙ ПРАСТОРЫ

«Паводле нашых ацэнак, працэс стварэння і запуску інтэграванай інфармацыйнай сістэмы саюза ідзе павольна. Мы будуем яе ўжо каля 10 гадоў. Пры ўсёй маштабнасці і складанасці праекта такія вынікі складана прызнаць здавальняючымі. З амаль 90 агульных працэсаў нармальна працуюць крыху больш за 20», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

## РАСПРАЦОЎКА ПАГАДНЕННЯ АБ АДЗІНАЙ СІСТЭМЕ МЫТНАГА ТРАНЗІТУ

Па словах кіраўніка дзяржавы, гэты кірунак з'яўляецца працягам пытання аб транзітным патэнцыяле. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што прыняцце гэтага пагаднення разам з Пагадненнем аб выкарыстанні ў ЕАЭС навігацыйных пломбаў для адсочвання перавозак будзе садзейнічаць павелічэнню транзітнага патоку тавараў.

## СІСТЭМА ПЛАНАВАННЯ АГРАРНА-ПРАМЫСЛОВАГА КОМПЛЕКСУ

Беларускі лідар падкрэсліў, што сістэму сярэднетэрміновага і доўгатэрміновага планавання АПК трэба ўкараніць для далейшага развіцця аграпрамысловага комплексу. Пры гэтым варта ўлічваць развіццё сусветнага аграрнага рынку.

«Мы павінны сур'ёзна задумацца аб харчовай бяспецы нашых краін, абароне ад знешніх цэнавых шокаў, выкліканых ажыятажным попытам на тую ці іншую сельскагаспадарчую прадукцыю. Варта таксама выйсці на канчатковае рашэнне праблемы аднабаковых забарон і абмежаванняў на пастаўку тавараў. Адпаведна, трэба забяспечыць своечасовы і паўнавартасны міждзяржаўны абмен інфармацыяй у сферы санітарнага, фітасанітарнага і ветэрынарнага кантролю», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

## ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ

«У ЕАЭС пакуль занадта мала зроблена па імпартазамяшчэнні. Відавочна, што гэты працэс павінен быць увязаны з прамысловай кааперацыяй у саюзе. Каб пазбегнуць пратэкцыянізму на нацыянальным узроўні, неабходна максімальна выкарыстоўваць прамысловыя магутнасці і рэсурсы нашых краін. Важна не проста садзейнічаць вытворчаму супрацоўніцтву, але і стымуляваць больш прасунутыя формы кааперацыі шляхам стварэння наднацыянальных еўразійскіх кампаній або кансорцыумаў», — заўважыў Прэзідэнт.

## УДАСКАНАЛЕННЕ ФІНАНСАВАЙ ІНФРАСТРУКТУРЫ

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, удасканаленне фінансавай інфраструктуры ЕАЭС патрабуецца ў тым ліку для падтрымкі прамысловай кааперацыі. «Для павелічэння колькасці сумесных праектаў з высокай інтэграцыйнай часткай трэба забяспечыць доступ да праектнага фінансавання ў выглядзе доўгатэрміновых крэдытаў з ільготнай працэнтнай стаўкай. Для гэтага трэба змяніць фармат работы Еўразійскага банка развіцця. Галоўныя недахопы ў яго цяперашняй мадэлі — высокі парог фінансавання праектаў і адсутнасць ільготнай стаўкі па крэдытах», — канстатаваў ён. Прэзідэнт звярнуў увагу, што таксама для сумесных распрацовак неабходна больш актыўна прыцягваць нацыянальныя інстытуты развіцця.

## ПАШЫРЭННЕ ВЫКАРЫСТАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ВАЛЮТ

«Празмернае выкарыстанне ў разліках той ці іншай замежнай валюты пазбаўляе нас канкурэнтных фінансавых і эканамічных пераваг, пагражае бяспецы нашых краін. Таму дзе, як не ў ЕАЭС, нам варта апераджальнымі тэмпамі выходзіць на выкарыстанне нацыянальных валют», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што вырашэнне пазначаных пытанняў дазволіць хутчэй пераадолець наступствы эканамічнага спаду, выкліканага пандэміяй, аднавіць дзелавую актыўнасць, прастымуляваць рост прамысловай вытворчасці, палепшыць транзітны патэнцыял і канкурэнтнае асяроддзе агульнай эканамічнай прасторы.

«У Беларусі перакананы, што пры наяўнасці добрай волі сумеснымі намаганнямі нам удасца ў поўнай меры рэалізаваць усе магчымасці Еўразійскай эканамічнага саюза і дасягнуць пастаўленых мэт», — канстатаваў Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### Каментарый у тэму

## У ЕАЭС РАСПРАЦАВАНЫ МЕРЫ ПА РЭАГАВАННІ НА САНКЦЫІ

Выніκі пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета для журналістаў падвёў віцэ-прэм'ер Беларусі Ігар Петрышэнка.

Ён расказаў, што ў ЕАЭС захоўваюцца рознагалоссі ў пытанні фарміравання агульнага рынку газу. Па словах віцэ-прэм'ера, гэтыя рознагалоссі не новыя, яны былі яшчэ ў 2018 годзе, калі падпісваліся канцэптуальныя дакументы, тады гэтая тэма была вынесена за дужкі.

«Маецца на ўвазе тарыфаўтварэнне на транспарціроўку газу па тэрыторыі ЕАЭС. Краіны, якія не валодаюць гэтымі рэсурсамі, зацікаўлены ў тым, каб пры гэтым былі роўныя ўмовы. А не так, што для нацыянальных суб'ектаў адны ўмовы, а для суб'ектаў, якія знаходзяцца па-за тэрыторыяй краіны, якая валодае гэтымі рэсурсамі, — іншыя», — растлумачыў Ігар Петрышэнка.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў разгледзець і вырашыць гэтае застарэлае пытанне ў вочным фармаце ў найбліжэйшы час. Удзельнікі пасяджэння, кіраўнікі іншых дзяржаў прапанову падтрымалі.

Закранался тэма ўстанаўлення тарыфаў на транспарціроўку газу з краін, якія не ўваходзяць у Еўразійскі эканамічны саюз.

Ігар Петрышэнка таксама паведаміў, што ўдзельнікі пасяджэння ўдзялілі ўвагу рэагаванню на неабгрунтаваны санкцыйны ціск. Сёння ў межах ЕАЭС выпрацавана шэсць мер па рэагаванні на санкцыі. «Гэта канкрэтныя падыходы, якія мы будзем прымяняць, запусціўшы механізм», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Займацца гэтым будзе адпаведная камісія. «Яна разглядае, рыхтуе прапанову і інфармуе Вышэйшы Еўразійскі эканамічны савет, які прымае рашэнне аб запуску інструментара з шасці мер. Маецца на ўвазе кансультацыя, ацэнка шкоды, якая наносіцца краіне, узгадненне на ўзроўні Еўразійскі эканамічны саюз, перагаворы з трэцімі краінамі і шэраг іншых напрамкаў. Гэта важны і вялікі крок, якім мы будзем калектыўна, нашым інтэграцыйным утварэннем, рэагаваць на неабгрунтаваны ціск», — дадаў Ігар Петрышэнка.

# «Вакцыны павінны быць здабыткам усяго чалавецтва»

### Каментарый у тэму

## «ЗДАРОЎЕ ПАВІННА БЫЦЬ ПА-ЗА ПАЛІТЫКАЙ»

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Ханс Клюге сустрэўся з журналістамі і расказаў падрабязнасці свайго візіту ў Беларусь. У прыватнасці, ён паведаміў, што напярэдадні разам з міністрам аховы здароўя Дзмітрыем Піневічам яны падпісалі новы двухгадовы план супрацоўніцтва. Ханс Клюге расказаў пра тры аспекты, з якіх ён складаецца.

**Першы аспект — агульная медыцына, агульны медыцынскі ахоп.** «Гэта значыць, што кожны жыхар Беларусі павінен мець адкрыты доступ да сістэмы аховы здароўя незалежна ад сацыяльнага і фінансавага статусу. І ў гэтым кірунку Беларусь паказвае добрыя вынікі галоўным чынам за кошт таго, што захавала ахову здароўя з часоў СССР і напоўніла яе новым якасным зместам», — растлумачыў Ханс Клюге. Ён расказаў, што будзе працягнута супрацоўніцтва па зніжэнні кошту медыцынскіх прэпаратаў. У Беларусі створаны пул спецыялістаў, які працуе ў гэтым кірунку. Па словах прадстаўніка СААЗ, новым элементам супрацоўніцтва павінна стаць сумесная работа над лічбавізацыяй медыцынскіх паслуг, неабходна ўдзяліць увагу павышэнню ўзроўню прафесіяналізму медыцынскіх супрацоўнікаў і іх мабільнасці.

**Другі аспект — павелічэнне колькасці вакцынаваных.** «У 35 краінах з 53 у рэгіёне, за які я адказваю, назіраецца неабходнае плато, пры якім насельніцтва было вакцынавана. У асобных краінах назіраецца вакцынны скептыцызм. Я разумею асцярогі насельніцтва, таму што вакцыны былі распрацаваны ў кароткія тэрміны. Аднак варта ўлічваць, што медыцынскія прэпараты былі распрацаваны ў адпаведнасці з жорсткімі патрабаваннямі і паказваюць вынікі», — адзначыў ён.

Ханс Клюге падкрэсліў, што згодны з Аляксандрам Лукашэнкам: не павінна быць пакарання за адмову ад вакцынацыі, аднак варта ўвесці дадатковы стымул, які заклікаў бы людзей вакцынавацца. «Неабходна прапанаваць разнастайнасць вакцын. Гэта забяспечыць дадатковы давер з боку насельніцтва. На сустрэчы з кіраўніком дзяржавы я згадаў, што мне хацелася б, каб Беларусь далучылася да праграмы COVAX», — сказаў прадстаўнік СААЗ.

**Трэці аспект супрацоўніцтва — здароўе і дабрабыт.** Па словах Ханса Клюге, дзевяць з дзесяці чалавек паміраюць не ад вірусных, а ад хранічных захворванняў. На гэта ўплываюць чатыры фактары рызыкі: курэнне, алкаголь, маларухомы лад жыцця, харчаванне. «Я заклікаю ўсіх практыкаваць 25-хвілінныя трэніроўкі кожны дзень. Я згаджаюся тут з Аляксандрам Рыгоравічам: неабходна больш удзяляць увагі прапагандзе спорту сярод насельніцтва. Гэта самы танны і эфектыўны спосаб прафілактыкі любога захворвання», — сказаў ён.

Дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ акцэнтаваў увагу, што Беларусь — другая ў свеце краіна пасля Кубы, якая атрымала сертыфікат СААЗ аб прадухіленні перадачы ВІЧ ад маці да дзіцяці. Цяпер неабходна ўтрымліваць якасць, каб адпавядаць гэтаму сертыфікату.

«І галоўны прынцып — ніхто не павінен заставацца ззаду, таму неабходна дастукацца да ўсіх слаёў насельніцтва, уключаючы зняволеных, мігрантаў і іншыя неабароненыя слаі насельніцтва. Таму што здароўе павінна быць па-за палітыкай, здароўе — гэта ключавое права чалавека», — падкрэсліў Ханс Клюге.

Дырэктар Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ расказаў, што нядаўна было адзначана 30-годдзе супрацоўніцтва СААЗ і краін СНД. Быў падпісаны новы мемарандум аб супрацоўніцтве паміж медыцынскім саветам краін СНД і СААЗ. «Я звярнуўся з просьбай да Аляксандра Лукашэнкі, каб Беларусь выступіла свайго роду лідарам па прасоўванні ідэй і практыкі ў краінах СНД. Асабліва прымаючы да ўвагі, што Беларусь уваходзіць у склад выканаўчага камітэта СААЗ», — падзяліўся Ханс Клюге.

## «МЫ БАЧЫМ РОСТ КОЛЬКАСЦІ ВАКЦЫНАВАНЫХ АД COVID-19»

Міністр аховы здароўя Беларусі Дзмітрый Піневіч расказаў прадстаўнікам СМІ, што колькасць вакцынаваных ад COVID-19 у Беларусі павялічваецца добрымі тэмпамі.

«Мы ўжо бачым калі не ўсплёск, то рост колькасці вакцынаваных. Мы глядзім у большай ступені па тых, хто прайшоў вакцынацыю першым кампанентам, фактычна 2,5 мільёна ўжо вакцынаваны. І колькасць тых, хто праходзіць поўны цыкл вакцынацыі, павялічваецца добрымі тэмпамі. Адзінае, вядома, я выказваю шкадаванне, што, як заўсёды, у нас гэта некалькі пазней, чым трэба было. Але лепш позна, чым ніколі», — адзначыў Дзмітрый Піневіч.

Міністр расказаў, што разам з дырэктарам Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ наведаў дзіцячую інфекцыйную бальніцу. Падчас пандэміі спецыялісты гэтай установы дапамагаюць не толькі дзецям, але і дарослым. Па словах Дзмітрыя Піневіча, у рэанімацыйным аддзяленні не было ніводнага вакцынаванага пацыента. Але ва ўсіх рэгіёнах краіны фіксуецца рост захворвання на каранавірус. Таму міністр аховы здароўя яшчэ раз заклікаў выконваць меры сацыяльнага дыстанцыравання, выкарыстоўваць сродкі індывідуальнай аховы і вакцынавацца.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# «За намі — праўда»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА выступіла на пленарным пасяджэнні трэцяга Еўразійскага жаночага форуму на тэму «Жанчыны: глабальная місія ў новай рэальнасці» ў Санкт-Пецярбургу, які праводзіць Савет Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі і МПА СНД.**

«2020 год стаў для нас выпрабаваннем. Нахабнае і цынічнае ўмяшанне знешніх сіл парушыла звыклае жыццё. Супраць нашай краіны разгорнута маштабная і інтэнсіўная гібрыдная вайна, у тым ліку шляхам выкарыстання сацыяльных сетак інтэрнэту. На вялікі жаль, у палітычныя гульні былі ўцягнутыя некаторыя нашы суайчыннікі. Паддаўшыся на правакацыі варожых медыя, аблудныя сталі інструментам у руках ідэолагаў каляровых рэвалюцый. Яны бяздумна дзейнічалі па чужой указцы, распальваючы варожасць сярод суседзяў, калег і нават у сваіх сем'ях. Балюча было бачыць, як замахваліся на нацыянальныя асновы і каштоўнасці, абражалі дзяржаўныя сімвалы. У белай вопратцы, з чырвонымі кветкамі яны ладзілі акцыі і пад народныя песні пад выглядам мірнага пратэсту на самай справе дзейнічалі супраць дзяржавы. Адкрытае расчараванне і глыбокі сорам беларускай нацыі — асобныя грамадзянкі. Насуперак прыродзе беларускай жанчыны — быць захавальніцай сямейнага дабрабыту, крыніцай творчага натхнення і духоўнасці, сімвалам міласэрнасці і гармоніі — яны спачатку выйшлі на вуліцы, а цяпер абіваюцца па чужым жыллі. Выпрошваючы гранты і заклікаючы да санкцый, яны гандлююць дабрабытам людзей у нашай краіне», — адзначыла спікер у сваім выступленні.

Наталля Качанава падкрэсліла: мы, беларусы, не можам прыняць гэтага. «У нашай генетычнай памяці жывыя ўзрушэнні разбуральных войнаў, развязаных не намі і не па нашай волі. У гэтым годзе роўна 100 гадоў, як беларускія землі па-жывым былі разарваны на заходнія і ўсходнія, і толькі ў 1939 годзе іх атрымалася аб'яднаць. Менавіта ў 2020 годзе мы адзначылі 75-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, дзе загінуў кожны трэці наш жыхар. Усе сілы добрай волі ў нашай краіне з'ядналіся супраць бяздушных і карыслівых спроб чарговы раз падзяліць нас, беларусаў, і жыўцом пахаваць нашу дзяржаўнасць. Прадстаўнікі беларускага народа — члены Савета Рэспублікі, дэпутацкі корпус, працоўныя калектывы, прафесійныя саюзы, грамадскія аб'яднанні — заклікалі сусветную супольнасць пакінуць Беларусь у спакоі і не перашкаджаць нам самастойна будаваць свой лёс. Мы заўсёды гатовы да адкрытага і сумленнага дыялогу з усімі. Мы заўсёды будзем імкнуцца захоўваць мір, спакой і парадак на Зямлі, нармальныя чалавечыя адносіны», — адзначыла яна.

«Мы захавалі сваю дзяржаўнасць. Бо за намі — праўда. І мы канчаткова зразумелі, хто ёсць хто, — канстатавала Старшыня Савета Рэспублікі. — Знешнія намаганні па дэстабілізацыі абстаноўкі ў Беларусі не спыняюцца, становяцца ўсё больш дзёрзкімі і ўдасканаленымі. Радыкалізацыя нарастае: замах на журналіста, спробы падпалаў дамоў дэпутатаў і дзяржслужачых. А нядаўна — нахабнае забойства супрацоўніка Камітэта дзяржаўнай бяспекі пры выкананні службовага абавязку. Любое адэкватнае дзеянне з боку Беларусі — ці то прадастаўленне аэрапорта для пасадкі самалёта з-за тэрарыстычнай пагрозы, ці то абарона дзяржаўнай граніцы ад патоку нелегальных мігрантаў — выклікае ўсплёск эмоцый. І гэта амаль адразу пазбаўляе магчымасці абмеркавання нашых дзеянняў у рацыянальным рэчышчы», — сказала спікер.

Але важна, што ў гэтым свеце мы не адны. «Ёсць тыя, хто глядзіць з намі ў адзін бок, для каго добрасуседства і прыстойнасць, гуманнасць і справядлівасць — гэта не проста прыгожыя словы, а прынцып жыцця. Мы ўдзячныя ўсім краінам, якія падтрымалі нас у гэты няпросты час і падтрымліваюць цяпер. І, вядома, нашаму брацкаму народу — расіянам — і кіраўніцтву краіны. Пройдзеныя выпрабаванні загартавалі нас, памножылі сілу духу. Мы ў поўнай меры ўсвядомілі каштоўнасць нашага адзінства. Менавіта таму 2021-ы аб'яўлены ў Беларусі Годам адзінства. 17 верасня мы ўпершыню адзначылі новае беларускае свята — Дзень народнага адзінства, — дадала яна. — Падзеі 2020 года датычацца не толькі Беларусі. Гэта наша агульная праблема. Бо акурат цяпер у аналагічнай сітуацыі можа быць абсалютна любая дзяржава. З дапамогай электронных гаджэтаў і інтэрнэту можна падарваць стабільнасць і спакой у любым пункце свету. Таму сёння ніяк нельга быць абыякавым. Трэба ісці насустрач, шукаць кропкі спалучэння, слухаць і чуць адзін аднаго, дапамагаць у любых цяжкіх сітуацыях. Напрыклад, як гэта адбываецца ў нас з Расіяй і Кітаем у барацьбе з COVID-інфекцыяй. Мы без прамаруджання накіравалі гуманітарную дапамогу кітайскаму народу, які першым сутыкнуўся з пандэміяй. У сваю чаргу нашы стратэгічныя партнёры дапамагаюць нам супрацьстаяць гэтаму выкліку. Мы бязмежна ўдзячныя кіраўніцтву, народам Расіі і Кітая за цеснае, адкрытае супрацоўніцтва з Беларуссю».

**Паводле БелТА.**

# СУПРАЦЬ НАЦЫЗМУ І ЭКСТРЭМІЗМУ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка падпісаў пастанову Савета Міністраў № 575 «Аб мерах процідзеяння экстрэмізму і рэабілітацыі нацызму», паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

Згодна з дакументам, суб'екты процідзеяння экстрэмізму і рэабілітацыі нацызму накіроўваюць у МУС не радзей за адзін раз у паўгоддзе інфармацыю аб прымяненні адпаведных мер. Зацвярджаюцца формы, па якіх МУС вядзе пералікі арганізацый, фарміраванняў, індывідуальных прадпрымальнікаў, грамадзян Беларусі, замежных грамадзян або асоб без грамадзянства, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці. Гэтыя пералікі размяшчаюцца на афіцыйным сайце МУС.

У пастанове рэгламентуецца маніторынг выканання заканадаўства аб недапушчэнні рэабілітацыі нацызму. Пры выяўленні парушэнняў суб'екты маніторынгу інфармуюць органы ўнутраных спраў, дзяржбяспекі, пракурора для вырашэння пытання аб прыняцці мер процідзеяння рэабілітацыі нацызму.

Таксама дакумент зацвярджае палажэнне аб ацэнцы сімволікі і атрыбутыкі, інфармацыйнай прадукцыі на прадмет наяўнасці ў іх прыкмет праявы экстрэмізму і палажэнне аб рэспубліканскай камісіі па правядзенні названай ацэнкі, якая ствараецца пры Міністэрстве інфармацыі. У абласцях таксама будуць створаны адпаведныя камісіі. Падставай для правядзення ацэнкі будзе зварот дзяржорганаў, якія ажыццяўляюць процідзеянне экстрэмізму. Рашэнне камісіі прымаецца простай большасцю галасоў пры вочным (на пасяджэнні) альбо завочным (з дапамогай пісьмовага апытання) галасаванні. Узначаліць рэспубліканскую камісію намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Лілія Ананіч, яе намеснікам будзе намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі. Сярод членаў камісіі — прадстаўнікі дзяржаўных органаў і арганізацый, спецыялісты па сацыялогіі, філасофіі, філалогіі, псіхалогіі.

Пастанова Савета Міністраў уступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

## БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 16 кастрычніка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Барысавіч СТРАХАР. Тэл. 8 022 250 18 69;
- першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

## Надвор'е

# Туманы і невялікія дажджы

### А ў пачатку наступнага тыдня ў начныя гадзіны зноў магчымыя замаразкі

**У другой дэкадзе кастрычніка ў нашай краіне адбылася змена характару надвор'я. Пасля працяглага ўплыву антыцыклону ў атмасферы ўсталяваліся заходнія паветраныя патокі, і ў Беларусь накіравалася больш вільготнае і няўстойлівае паветра атлантычнага паходжання. З'явілася больш воблачнасці, а ў канцы тыдня чакаюцца кароткачасовыя дажджы і туманы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу ўмовы надвор'я ў Беларусі ўначы ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, калі адаб'ецца ўплыў чарговага малаактыўнага атмасфернага фронту з боку Заходняй Еўропы. У другой палове дня месцамі прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Максімальная тэмпература паветра будзе дасягаць ад плюс 8 градусаў да 14 цяпла.

А вось 16 кастрычніка ўмовы надвор'я працягне фарміраваць атмасферны фронт і няўстойлівыя паветраныя масы, якія паступаюць да нас з Балтыйскага мора. У суботу захаваецца няўстойлівае надвор'е. Уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень месцамі па краіне пройдуць дажджы рознай інтэнсіўнасці. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 2 да плюс 8 градусаў, удзень — 8—14 цяпла.

Нязначная змена надвор'я пачнецца ў нядзелю. У гэты дзень адбудзецца рост атмасфернага ціску, таму дажджы на большай частцы тэрыторыі краіны спыняцца. Аднак у паўночнай частцы краіны адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 1 градуса да 6 цяпла. Удзень слупок тэрмометра пакажа 6—13 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня тэрыторыя нашай краіны апынецца пад уплывам няўстойлівых паветраных мас, якія прыйдуць з Балтыйскага мора. У асобных раёнах — кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны высокая верагоднасць фарміравання туманаў. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, удзень — 7—13 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Нарвегіі з лука забіты пяць чалавек

Трагедыя адбылася ў горадзе Конгсберг, што на поўдні Нарвегіі. Яшчэ двое мінакоў атрымалі раненні. Вядома, што падазраваны арыштаваны, ім аказаўся 37-гадовы датчанін. Пра матывы злачынцы не паведамлялася, але не выключаецца версія тэрарыстычнага акта. Нападзенне стала самым маштабным па колькасці ахвяр з часоў тэракта Брэйвіка. Відавочцы падзей распавялі, што злачынца перамяшчаўся хаатычна і страляў ва ўсіх, хто трапляўся яму на шляху. Паліцыя выявіла вялікую колькасць стрэл, якія тырчаць са сцен дамоў. Паведамляецца, што забойца некаторы час таму прыняў іслам і трапляў у поле зроку правааахоўнікаў у сувязі з прыкметамі радыкалізацыі. Улады заявілі, што сітуацыя знаходзіцца пад кантролем. Мэр Конгсберга Ганне Санд сказала нарвежскай газеце VG, што для горада гэта стала сапраўднай трагедыяй. «Мы робім усё, што ў нашых сілах», — дадала яна, а таксама паведаміла, што ў адной з гасцініц разгорнуты цэнтр дапамогі пацярпелым. Пасля нападзення ўпраўленне паліцыі Нарвегіі загадала ўсім супрацоўнікам насіць агнястрэльную зброю. Звычайна нарвежскія паліцэйскія не ўзброеныя і атрымліваюць доступ да зброі ў выпадку неабходнасці.

## Прыродныя катаклізмы абышліся ЗША ў $100 млрд

Іх ахвярамі сёлета сталі 538 чалавек, паведаміла Axios са спасылкай на даклад Нацыянальнага ўпраўлення акіянічных і атмасферных даследаванняў ЗША (NOAA). Як адзначаецца, за першыя дзевяць месяцаў 2021 года ў Злучаных Штатах адбылося 18 прыродных катастроф, сярод гэтых бедстваў аказалася чатыры трапічныя цыклоны, дзве



паводкі, адна хваля спёкі і засухі, адзін прыродны пажар і адна хваля маразоў і снегападаў. Самым дарагім прыродным катаклізмам 2021 года на дадзены момант з'яўляецца ўраган «Іда». На аднаўленне пасля яго ўжо было выдаткавана больш за 60 мільярдаў долараў, і, як адзначае Axios, гэтая сума, верагодна, працягне павялічвацца.

## Geely запускае вытворчасць касмічных спадарожнікаў



Кітайскі аўтамабільны кангламерат Geely, які таксама валодае некаторымі еўрапейскімі брэндамі, такімі як Volvo, Lotus і Smart, абвясціў аб сходзе з канвеера першага спадарожніка, дастаўленага з новага завода ў Тайчжоў, у кітайскім горадзе ў правінцыі Чжэцзян, у сталіцу. Мяркуецца, што гэтае прадпрыемства будзе выпускаць па 500 спадарожнікаў штогод. Ліцэнзія на камерцыйную вытворчасць ужо атрымана, таксама ў лютым было адобрана ўрадам КНР выдзяленне дыяпазону частот. Вытворчы цэнтр быў пабудаваны па мадэлі SpaceX — вертыкальнай, гіпераўтаматызаванай вытворчасці. Галоўнай задачай кітайскага кангламерата з'яўляецца стварэнне ўласнай спадарожнікавай групоўкі Geely. Чакаецца, што першыя з апаратаў, выраблены карпарацыяй, будуць запушчаны ўжо ў сярэдзіне наступнага года.

# Расці здаровай, Арынка!



**Да Дня маці старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр Рагачук прымеркаваў сустрэчу з Кацярынай Рудніцкай і яе дачкой Арынкай, якую летась ратавалі ўсім горадам.**



У многіх брастаўчан яшчэ на памяці гісторыя сям'і Рудніцкіх са шчаслівым фіналам. Летась у снежні малой Арыне паставілі страшны дыягназ — спінальная мышачная атрафія 2-га тыпу (генетычная хвароба, абумоўленая «паломкай» гена, які адказвае за мышачную актыўнасць). Для лячэння быў патрэбны прэпарат «Зонгенсма» амерыканскай вытворчасці коштам больш за два мільёны долараў. І ўвесці яго неабходна, пакуль дзіця не дасягнула ўзросту два гады. У бацькоў заставалася паўгода, калі ў студзені быў аб'яўлены збор сродкаў. У кампанію ўключыліся арганізацыі і ўстановы горада, ішлі дабрачынныя канцэрты, апарат гарвыканкама замест святочных карпаратываў ахвяроўваў грошы на рахунак Арыны. Але грошай не хапала, і ў апошні момант асноўную суму пералічыла прадпрыемства «Савушкін прадукт», дзе працуюць бацькі Арыны. У маі ў Мінску быў зроблены выратавальны ўкол. Зараз дзяўчынка праходзіць далейшую рэабілітацыю.

І на Свята маці мэр запрасіў Кацярыну Рудніцкую ў гарвыканкам, дзе выказаў захапленне самаадданасцю жанчыны, якая не зламалася пад цяжарам гора, а стала асноўным арганізатарам збору сродкаў на выратаванне дачкі. Аляксандр Рагачук пажадаў іх сям'і шчасця і дабрабыту.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з тэлеграм-канала Аляксандра РАГАЧУКА.**

# НЯБЕДНА ЖЫЦЬ НЕ ЗАБАРОНІШ

«Увядзенне ў Беларусі добраахвотнай назапашвальнай пенсіі — гэта чаканая мера, — лічыць **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Ларыса ЯШКОВА**. — Попыт на ўвядзенне такога віду страхавання ўжо быў даўно. Але праграма, якая прапануецца па Указе № 367, — новы, будзем казаць, падвід страхавання, які мае некаторыя адметныя рысы».

Указ прадугледжвае асаблівы парадак страхавання, які ўвязаны з падтрымкай, суфінансаваннем дзяржавай страхавых узносаў і назапашваннеў разам з працаўніком дапенсійнага ўзросту.

Прадстаўнік Мінпрацы адзначыла, што дзеянне дакумента распаўсюджваецца на абмежаванае кола асоб, якія пасля і змогуць атрымліваць дадатковыя выплаты да пенсіі.

«Гэтая схема ахоплівае людзей, якія працуюць і маюць работадаўцу, які выплачвае абавязковыя ўзносы на дзяржаўнае пенсійнае страхаванне ў фонд сацыяльнай абароны насельніцтва», — патлумачыла Ларыса Яшкова.

## ДЗЕ І ЯК АФОРМІЦЬ ДАДАТКОВУЮ ПЕНСІЮ

Згодна з указам, ажыццяўляць добраахвотнае пенсійнае страхаванне будзе РУСП «Стравіта». Па словах **генеральнага дырэктара прадпрыемства Сяргея АНДРЫЕВІЧА**, збіраць тоўсты пакет дакументаў не спатрэбіцца. Дастаткова заключыць дагавор і прапісаць умовы па жаданні будучага пенсіянера.

Чалавек павінен вызначыць два моманты заключэння дагавора страхавання: памер унёску, які ён будзе сам плаціць за сябе, што можа быць ад 1 да 10 % ад заробку, і вызначыць перыяд, на працягу якога ён штомесяц будзе атрымліваць гэтую дадатковую пенсію — на працягу 5 ці 10 гадоў.

Разам з тым адпаведны дагавор змогуць заключыць не ўсе. Існуе лімітавы ўзрост.

«Указ мае абмежаванні, то-бок, працоўны грамадзянін, якому да выхаду на пенсію засталося менш за тры гады, ужо не скарыстаецца дадзеным механізмам страхавання, — адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення страхавога нагляду Міністэрства фінансаў Сяргей АСЕНКА**. — Але ёсць магчымасць скарыстацца класічнымі відамі страхавання дадатковай пенсіі, якія ў краіне існуюць. Сёння дзве кампаніі, якія аказваюць такія паслугі: тая ж «Стравіта» і кампанія «Прыёрлайф».

Па словах прадстаўніка дзяржаўнай страхавой кампаніі, штомесячная дадатковая выплата да пенсіі можа быць дастаткова істотнай.

«Напрыклад, калі б з 45 гадоў мужчына выплачваў 27 рублёў штомесяц на дадатковую пенсію, то на працягу пяці гадоў пры выхадзе на пенсію ён будзе дадаткова атрымліваць штомесяц 244 рублі, — гаворыць Сяргей Андрыевіч. — Пры выплаце ўзносу ў 58 рублёў ён будзе мець 529 рублёў дадатковай пенсіі. Практычна гэта другая пенсія».

## А ЦІ ЁСЦЬ ГАРАНТЫІ, ШТО ВЫПЛАТЫ АДБУДУЦЦА ПРАЗ ДВА-ТРЫ ДЗЯСЯТКІ ГАДОЎ?

Як падкрэсліў генеральны дырэктар «Стравіты», на сёння выплаты па дагаворах страхавання, якія заключаюцца з дзяржстрахаўшчыкамі, па заканадаўстве гарантуюцца дзяржавай.

«Мы фарміруем гарантыйны фонд, які гэтак жа можа быць выкарыстаны пры немагчымасці выканання страхаўшчыкам сваіх абавязацельстваў», — адзначыў ён.

Калі ж чалавек перадумаў і хоча вярнуць свае выплаты, якія збіраў некалькі гадоў, то ў яго гэта не атрымаецца адразу. Справа ў тым, што механізму скасавання дагавора ўказ не прадугледжвае. Але работнік, змяняючы месца жыхарства, проста можа прыпыніць выплату ўзносаў. А тыя назапашаныя грошы фіксуюцца, і пры дасягненні пенсійнага ўзросту ён таксама зможа атрымаць гэтую назапашаную суму, запэўніў прадстаўнік страхавой кампаніі.

Пры гэтым, як падкрэсліў прадстаўнік Мінфіна, грошы на рахунку працягваюць назапашвацца, незалежна ад таго, вядзе адлічэнні чалавек ці не.

«Акрамя таго, што назапашаная сума фіксуецца, яшчэ ёсць гарантаваная прыбытковасць, якая таксама працягвае налічвацца на гэтую суму грошай, — растлумачыў Сяргей Асенка. — Да выхаду чалавека на пенсію даплата павялічыцца на суму гарантаванай прыбытковасці. Плюс яшчэ страхавая кампанія будзе налічваць дадатковую прыбытковасць зыходзячы з даходаў, якія яна атрымала за кошт інвестыцый».

## ДАДАТКОВАЯ ПЕНСІЯ Ў СПАДЧЫНУ

Па словах Сяргея Андрыевіча, у дакуменце прапісана, што ў выпадку, калі страхавальнік не дажыў да пенсійнага ўзросту, то ўсе назапашаныя грошы плюс даход атрымліваюць яго спадчыннікі.

«Нават калі чалавек выйшаў на пенсію, але праз нейкі час пайшоў з жыцця, усё, што належыць яму па дагаворы, нашчадкі таксама атрымаюць. Ёсць яшчэ магчымасць атрымання гэтых грашовых сродкаў, калі надыходзіць інваліднасць у працэсе работы, датэрмінова. Назапашаную суму з прыбыткам наш страхавальнік таксама атрымае», — адзначыў спікер.

Што датычыцца арганізацый, чые работнікі скарыстаюцца праграмай добраахвотнага страхавання дадатковай назапашвальнай пенсіі, то прадстаўнік Мінпрацы запэўніла, што новы механізм нічым не абцяжарыць работадаўцу.

«Ён як выплачваў унёскі за гэтага работніка, так і працягвае іх далей плаціць у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва. І прычым тарыф узносаў для яго не павялічваецца», — падкрэсліла Ларыса Яшкова.

Спецыялісты звярнулі ўвагу на тое, што ўказ «Аб добраахвотным страхаванні дадатковай назапашвальнай пенсіі» ўступіць у сілу з 1 кастрычніка 2022 года. Таму ўжо восенню наступнага года можна будзе наведаць офіс дзяржаўнай страхавой кампаніі або запоўніць заяву аб страхаванні анлайн на сайце.

Пасля заключэння дагавора страхавання неабходна прадставіць наймальніку копію гэтага дакумента, а таксама напісаць заяву на ўтрыманне страхавога ўзносу з заработнай платы.

Далей уся адказнасць за разлікі і пералічэнні ляжыць на наймальніку. Выплата робіцца штомесяц шляхам утрымання наймальнікам з заробку страхавальніка і пералічэння на рахунак страхавой кампаніі, якія вызначаны для грамадзяніна ў дагаворы страхавання.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ПРАКАНТРАЛЯВАЦЬ НАШЭННЕ МАСАК

## НЕ ХАДЗІ ДАЛЁКА

Даведацца, як выконваецца пастанова — такім было рэдакцыйнае заданне. Пакуль журналіст «Звязды» з васьмі да дзевяці гадзін раніцы дабіраўся ў Віцебскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі, каб далучыцца да ўдзельнікаў тэматычнага маніторынгу, заўважыў шмат парушэнняў. І першыя — у маршрутным таксі: побач з кіроўцам сядзела дама без медыцынскай маскі. У салоне людзей было нямнога, у двух з іх таксама не было на тварах нічога ахоўнага ад распаўсюджвання віруса.

У ларку, дзе вырашыў купіць жавальную гумку, гандлярка была без маскі і не «замаскіравалася», калі працягвала мне тавар і чакала, пакуль разлічуся карткай. У аўтобусе заўважыў пару пасажыраў без масак. А ў некалькіх з тых, хто «экіпіраваны», сродкі аховы былі спушчаны пад нос.

Спецыяльна вырашыў праверыць усе віды грамадскага транспарту, бо час на гэта быў. У тралейбусе, які праязджаў міма, таксама не ўсе былі ў масках, як і ў трамваі.

Пра таксі... Угадаеце з трох разоў? Маскі былі і ў кіроўцы, і ў пасажыра! Вау! Але прыспушчаныя. А санітарнымі нормамі і правіламі дакладна прадугледжана абавязковасць насіць маску, якая закрывае нос, рот і падбародак.

Дарэчы, ліфт — таксама сродак транспарту, і, нават калі едзеце вы адзін, гэта ўсё роўна грамадскае месца. Напэўна, людзі не разумеюць, што маскі і сацыяльная дыстанцыя (1-1,5 метра) для таго, каб яны не заразіліся і іх не заразілі.

**Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач горада Віцебска і Віцебскага раёна, галоўны ўрач дзяржаўнай установы «Віцебскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» Мікалай КРАСОЎСКІ** расказаў, што толькі за мінулыя выхадныя яго падначаленыя наведалі сорак грамадскіх месцаў, прыкладна ў палове выявілі парушэнні, склалі пяць пратаколаў. «Адпрацоўвалі» крамы, грамадскі транспарт, вакзалы. Па ўсіх кірунках работа ідзе, падкрэсліў суразмоўца. Накont пакарання: памер штрафу на індывідуальнага прадпрымальніка — да 200 базавых велічынь, юрыдычную асобу — да 500. А незакорнапаслухмяныя грамадзяне могуць заплаціць да 30 базавых (870 рублёў).



## ЗАБЫЎ — ПАДОРАЦЬ

У крамы мы адправіліся разам з **урачом-гігіеністам аддзялення гігіены харчавання Людмілай КАМЛЁНАК**. Мы наведалі крамы «Віталюр», «Еўраопт», «Веста». Урач адразу прасіла супрацоўнікаў выклікаць кіраўніка, і пачыналася вельмі пільнае назіранне. А перад гэтым звяртала ўвагу, ці ёсць інфармацыя на ўваходных дзвярах пра неабходнасць насіць маску, на тое, ці хутка можна знайсці сродак для апрацоўкі рук, ці зручна ім карыстацца.

Цікавілася тым, як апрацоўваюць рукі работнікі крам; праверыла журналы, дзе рэгіструецца тэмпература цела перад пачаткам працы; задавала пытанні, як часта мыюць падлогу, ці дадводзіцца нагадваць пакупнікам, што без маскі іх не абслужаць. Сур'ёзных канфліктаў пакуль не было.

У «Весце» аўтар гэтых радкоў вырашыў пацікавіцца ў пакупніцы, чаму яна без маскі. Ветліва, канешне, а ў адказ пачуў, што «яе ўсе «дасталі» і іншае. Увага гігіеніста і работніц крамы прымусілі жанчыну змяніць тон. Зрэшты, удзельнікі маніторынгу маглі выклікаць міліцыю, і гэта пацягнула б штраф на вялікую суму.

Цікава, што ў «Еўраопце», самым вялікім у вобласці, асабліва няпамятлівым маскі вырашылі проста дарыць. Накont цэн: самая танная — 15 капеек.

## І ЕЖУ, І ГРОШЫ... ЗА ПРЫШЧЭПКУ

У «Еўраопце» завязалася размова аб недастатковай папулярнасці прышчэпак. Прадстаўніцы гандлю выказалі думкі аб неабходнасці больш пісаць і казаць на гэту тэму ў СМІ. Маўляў, трэба развейваць міфы. Напрыклад, некаторыя лічаць, што, калі яны зрабілі прышчэпку, а дамашнія не, апошнія заразяцца, бо «інфекцыя ў прышчэпцы». Другі міф — нізкая якасць кітайскай вакцыны. Вядома, што ў Кітаі нізкая смяротнасць ад каранавіруса і высокі працэнт прышчэпленых.

Сярод гандляроў крам, дзе рабіўся рэпартаж, кольказсць тых, хто ўжо зрабіў прышчэпку, можна на пальцах двух рук пералічыць. А ў адной з крам прышчэплены толькі адзін супрацоўнік. Цікава, што там за вакцынацыю можна атрымаць вельмі добры бонус: на 50 рублёў ёсць магчымасць купіць тавары ў фірмовай сетцы і яшчэ 50 рублёў — грошы ад прафкама.

Вельмі цікавы вопыт, бо такім чынам работадаўцы сродкі... эканомяць. Хворы гандляр, рабочы, журналіст — павелічэнне нагрузкі на яго калег, меншы вытворчы вынік плюс з бюджэту трэба аплачваць бальнічны.

Наўпрост на рабоце можна зрабіць прышчэпку, калі адначасова пагодзяцца чалавек 15-20. Прыязджаюць агітаваць нават прафесары...

***P. S.:*** Пасля рэпартажу зайшоў на «Смаленскі рынак». Маску перад уваходам нацягнуў на твар толькі я, побач людзі заходзілі без яе. Некаторыя пакупнікі на рынку былі ў масках, але не ва ўсіх яны былі надзетыя правільна. Рынак работнікі Віцебскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі абавязкова наведаюць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ЛЯЎКІ ПАД СЯННО І ЦІКАВІНКІ ЧЫЖОЎКІ

## Што можна зрабіць на месцах, каб прыцягнуць турыстаў

**Пандэмія назаўсёды змяніла турыстычны рынак, спажыўцоў, іх чаканні і патрэбы, зрабіла больш асцярожнымі ў плане выбару далёкіх маршрутаў, але ў той жа час паспрыяла пошукам новых шляхоў і адкрыццяў. Пытанні, звязаныя з магчымасцямі міжнароднага і трансгранічнага турызму, выкарыстаннем сучасных тэхналогій і патэнцыялу гісторыка-культурнай спадчыны, краязнаўчых даследаванняў, пошукам новых альтэрнатыў былі ўзнятыя на першай Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Перспектывы развіцця турызму ў сучасных умовах: сусветныя тэндэнцыі і рэгіянальныя кантэксты», арганізаванай Дэпартаментам па турызме Міністэрства спорту і турызму Беларусі, Нацыянальным агенцтвам па турызме сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук. У ёй узялі ўдзел прадстаўнікі турыстычных арганізацый, устаноў культуры, адукацыі і навукі, грамадскіх арганізацый.**



На «Чыжоўка-Арэну» можна вадзіць адмысловыя экскурсіі.

### ПУНКТЫ ПРЫЦЯГНЕННЯ

Мясціны, якія не могуць пахваліцца яскравымі архітэктурнымі аб'ектамі ці падзеямі, таксама могуць зазззяць па-новаму, калі знойдуць для іх уласныя «разыначкі». Калі пакорпацца ў гісторыі населенага пункта, можа ўсплыць багата цікавых падказак — магчыма, тут ладзіліся кірмашы, былі развітыя рамёствы, жылі выдатныя асобы, а можа, сёння ёсць адметныя кулінары (прадукты, тавары...), прыродныя сімвалы, міфы і паданні, вакол якіх можна «раскруціць» тэму новага фестывалю (згадаем «Лепельскага цмока», «Журавы і журавіны» ці Вішнёвы фестываль). Толькі важна падчас распрацоўкі новых маршрутаў і праграм не забывацца, што любы культурны аб'ект мае духоўнае значэнне, спрыяе развіццю асобы і фарміраванню густаў. І сачыць за тым, каб новыя ці запазычаныя з-за мяжы ідэі не падмянялі традыцыйныя каштоўнасці і не замінялі развіццю самабытнай мясцовай культуры.

Часта праблема турыстычнай непрывабнасці таго ці іншага раёна не ў тым, што там няма чаго паказаць, а ў адсутнасці мясцовага брэнда, упэўнены **навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксандр БАРАНОЎСКІ**. Ён прапануе звярнуць увагу на Сенненскі раён, пры распрацоўцы маршрутаў па якім можна рабіць акцэнты на яго ўраджэнцах: Машэраве, Азгуры, Гараўцы. Бясспрэчна, для таго каб сюды паехалі турысты, варта стварыць аб'екты для паказу. Нягледзячы на тое што ў гонар двойчы ўзнагароджаных медалём «Залатая Зорка» або (і) медалём «Серп і Молат», раней было прынята ставіць бюсты на радзіме. У вёсцы, дзе нарадзіўся Пётр Машэраў, такі памятны знак не паставілі, бо на той час яна была закінутая. У былым доме сям'і Машэравых, які часткова захаваўся, можна было б зрабіць мемарыяльны музей. Брэндам раёна магло б стаць ткацтва, каб турысты маглі не толькі наведаць памятны знак у гонар аўтаркі арнаменту на беларускім сцягу (Матрона Маркевіч жыла ў Сенненскім раёне), але і саткаць рушнік у мясцовым Доме рамёстваў. Аграгарадок Полымя мог бы стаць Сенненскімі Ляўкамі — тут у 1903—1904 гадах жыў і працаваў Янка Купала. У гэтым жа аграгарадку знаходзіцца сядзібны дом Свяцкіх, які патрабуе аднаўленчых работ, бо прамаруджванне можа прывесці да страты помніка архітэктуры XIX стагоддзя стылю позняга класіцызму. А можна яшчэ ўспомніць пра адну з найбуйнейшых танкавых бітваў пад Сянно, шматвяковы дуб каля вёскі Аляксандрава, Чортаў камень (другі па велічыні ў Беларусі) ці паганскае капішча каля былой вёскі Бачарова, ідал з якога быццам абяцае плоднасць бацькам і здароўе нашчадкам...

Магчыма, варта звярнуць увагу на аб'екты, да якіх раней не было прынята вадзіць турыстаў. Войны пакінулі на нашай зямлі шмат розных фартыфікацыйных збудаванняў. І чаму б іх не выкарыстоўваць пры распрацоўцы маршрутаў, прысвечаных Першай і Другой сусветным войнам, тым больш што нават без асаблівай рэкламы такія аб'екты ўжо прыцягваюць аматараў ваеннай гісторыі?.. Нават замежнікі нейкім чынам спрабуюць «выйсці» на мясцовых краязнаўцаў, каб паглядзець на... закінутыя дзоты. Музеі і аніміраваныя экскурсіі таксама выдатна кладуцца на такія аб'екты. **Кандыдат гістарычных навук Ігар МЕЛЬНІКАЎ** прапанаваў адну з турсцежак праклaсці да так званай Лініі Пілсудскага, польскіх міжваенных умацаванняў пад Баранавічамі, пры будаўніцтве якіх выкарыстоўваліся самыя сучасныя для таго перыяду дасягненні ваеннай інжынерыі. Да таго ж аб'ект можна выкарыстоўваць для распрацоўкі праекта, звязанага з падачай складанай міжваеннай гісторыі XX стагоддзя і падзелу Беларусі.

**Дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў гістарычнага факультэта БДУ Дзмітрый ФІЛІПЧЫК** упэўнены, што айчыннаму турысту, які ўжо паспеў паездзіць па сваёй краіне, трэба падаваць невядомыя факты пра вядомыя мясціны. Сёння жыхарам Оршы даводзіцца прыкладаць шмат намаганняў, каб пераламаць стэрэатып, што гэта горад, у якім тры турмы і ніводнага тэатра. Хоць за гэтымі мясцінамі стаіць цікавая, пакуль не ўзнятая і не «спакаваная» ў турпрадукт гісторыя. Унутраны турыстычны попыт спарадзіў неабходнасць уключаць новыя, раней мала задзейнічаныя гісторыка-культурныя аб'екты, і Орша можа стаць «тузом, які можна дастаць з рукава», каб распавесці пра гарадскую духоўную спадчыну пад іншым ракурсам. У XVII—XVIII стагоддзях тут было пабудавана дзевяць каталіцкіх і грэка-каталіцкіх кляштараў. І чаму б не паказваць горад як вялікі цэнтр манастырскай каталіцкай культуры, не расказваць пра дзейнасць і ўплыў розных ордэнаў (езуітаў, трынітарыяў, бернардынцаў, дамініканцаў, францысканцаў)? Натуральна, любая гісторыка-культурная каштоўнасць павінна быць нейкім чынам маркіравана. Самы просты спосаб — устаноўка інфармацыйных стэндаў. Таксама межы страчаных будынкаў варта выкладваць каляровай цэглай.

Можна прэзентаваць турыстам раёны і кварталы гарадоў. Так, цяпер раскрываецца патэнцыял сталічнай Чыжоўкі. Не здзіўляйцеся, гэты мінскі раён з часам зможа заняць турыста на цэлы дзень, і ўдзельнікі канферэнцыі ўжо паспелі пазнаёміцца з некаторымі яго цікавінкамі. Мясцовы парк закладваў яшчэ Машэраў. Кажуць, што тут захавалася дрэва, якое ён садзіў. Вуліца Ташкенцкая названа ў гонар беларускіх будаўнікоў, якія дапамагалі ў аднаўленні сталіцы Узбекістана пасля моцнага землятрусу. Раён мае адмысловыя аб'екты прамысловага і спартыўнага турызму, ужо сёння можна пабываць у адной з самых сучасных раздзявальняў для хакеістаў (пры яе ўзвядзенні нашых будаўнікоў кансультавалі канадскія спецыялісты) і даведацца, як ствараюцца ўмовы для спартыўных спаборніцтваў і трэніровак на лядовых палях «Чыжоўка-Арэны» (свая кампрэсарная станцыя ахаладжвае лёд знізу, а зверху стаіць сістэма кандыцыяніравання паветра, якая стварае пэўны мікраклімат, задае тэмпературу і вільготнасць).

### СПАДЧЫНА МІЛЬЯНЕРАЎ І ПАМЯЦЬ АБ ВАЙНЕ

Паступова пачынае «раскручвацца» як турыстычны цэнтр і такі населены пункт, як Чырвоны Бераг у Жлобінскім раёне. Ён можа пазнаёміць нас з рознымі старонкамі гісторыі. Непадалёку ад яго захавалася гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку (I тысячагоддзе да нашай эры — I тысячагоддзе нашай эры). Сваёй захаванасцю ўражвае сядзібна-паркавы комплекс Козел-Паклеўскіх. Захаваліся флігель, гаспадарчыя пабудовы, вінакурны завод. Але найбольш захапляе сядзібны дом сям'і мільянераў — (Козел-Паклеўскія лічыліся гарэлачнымі каралямі ў Расійскай імперыі, у іх уласнасці былі параходы, хімічныя і металургічныя заводы, шахты, банк). Гаспадары не пашкадавалі сродкаў на яго пабудову. Усе памяшканні выкананыя ў розных стылях: раманскі, класічны, гатычны, барока, ракако. І гэта адзіная ў Беларусі сядзіба, дзе ў афармленні адной з залаў выкарыстаны арабскі (ці маўрытанскі) стыль — альгамбра. Прычым інтэр'еры не пашкодзіў час — каваныя вырабы, ляпніна, плітка — аўтэнтычныя. Экскурсаводы вытлумачаць прычыну выдатнай захаванасці сядзібнага дома містыкай, што таксама любяць турысты. Будынак мае шмат абярэгаў, сярод якіх хімеры, кажан, кароны, маскі, матылі, трылісцік, лісткі вінаграду, дуба. На рагах будынка закладзеныя залатыя манеты. І расповед можна працягваць. Побач унікальны парк, асобныя дрэвы ў якім пасаджаныя яшчэ ў XIX стагоддзі.

А ў вёсцы Казімірава, непадалёк ад Чырвонага Берага, у манастыры Успення Прасвятой Багародзіцы захоўваецца цудатворны абраз Божай Маці Казіміраўскай. Лічыцца, што пры шчырай малітве каля гэтага абраза ў будучых маці роды праходзяць без ускладненняў...

Але найбольш Чырвоны Бераг сёння вядомы дзякуючы сваёй ваеннай гісторыі. Гэта адзінае месца ў Беларусі, дзе стаіць помнік дзецям — ахвярам вайны. Сёння музейшчыкам даводзіцца прыкладаць шмат намаганняў, каб супрацьстаяць запушчанай у інтэрнэце інфармацыі, што тут размяшчаўся донарскі лагер, дзе ў дзяцей бралі кроў. Насамрэч лагер быў перасыльным. Ад гэтых ведаў лягчэй не становіцца, усё роўна тут месца, якое нагадвае пра пакуты малых. З амаль дзвюх тысяч дзяцей, якіх вывезлі ў Германію, вярнуліся толькі адзінкі. На Дзень абароны дзяцей тут заўсёды праводзіцца жалобны мітынг, прыязджаюць высокія госці з усёй краіны. І гэтае месца магло б увайсці ў шэраг аб'ектаў, што распавядаюць пра вайну з розных бакоў. У дапаўненне да Хатыні, якая нагадвае пра ўсе спаленыя вёскі, Трасцянца — канкрэтнай гісторыі лагера і збіральнага вобраза лагераў падобнага тыпу, Мінскага гета — расповеду пра генацыд яўрэяў...



Экскурсаводы кажуць, што палац у Чырвоным Беразе захавалі ад разбурэння хімеры на фасадзе. Турысты такія містычныя аповеды любяць.

### ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ І «АЖЫЎЛЕННЕ» ГІСТОРЫІ

**Дацэнт кафедры музеялогіі, этналогіі і гісторыі мастацтваў БДУ Дзмітрый МАРОЗАЎ** прапаноўвае дадаць да атрыманай карціны яшчэ адзін аповед — пра лагеры для ваеннапалонных, бо пакуль гэтая гісторыя ў нас ніяк не музеефікуецца і не інтэрпрэтуецца. Адным з месцаў, дзе варта згадваць пра такую цяжкую спадчыну Вялікай Айчыннай вайны, магла б стаць тэрыторыя былога лагера Шталаг-352 у Масюкоўшчыне. Тут можна было б зрабіць алею памяці ці кампазіцыі, якія б паведамлялі, што ў Беларусі была створана цэлая сетка падобных лагераў, альбо падаць на інфармацыйным стэндзе карту іх размяшчэння.

Сёння расказваць пра трагедыю можна па-іншаму. «Захаваліся архітэктурныя помнікі, якія аднасяцца да часоў існавання лагера. Сама тэрыторыя «гаворыць», перадае атмасферу. І гэта ўнікальны комплекс для ўсёй тэрыторыі былога СССР. Важна пры развіцці горада не страціць дакументальнае сведчанне ў архітэктурных вобразах у самай структуры раёны. Пасля гэта будзе неаднаўляльнае», — заўважае Дзмітрый Марозаў.

Але як зрабіць такую тэрыторыю ў цэнтры жылога раёна? Можна выкарыстаць сучасныя сродкі — муралы. Напрыклад, Расійскае ваенна-гістарычнае таварыства ў Смаленску дзякуючы муралам змагло падаць шэраг гістарычных падзей, што адбываліся ў горадзе. Наносіць такія малюнкі з інфармацыяй можна не толькі на жылыя дамы. Тэхнічныя пабудовы, кацельні, трансфарматары і нават трубы, што стаяць у месцах, звязаных з жыццём і функцыянаваннем лагера, — выдатная экспазіцыйная плошча. Можна аднавіць фрагменты супрацьтанкавых валоў, такім чынам абазначыўшы межы лагера. Захавалася і брукаванка, якую выкладвалі ваеннапалонныя. Яна таксама можа быць жывым напамінам. Яшчэ важна размясціць інфармацыйныя цэнтры ў ключавых пунктах агляду з QR-кодамі, праз якія можна атрымліваць звесткі, калі асобы, неабыякавыя да гісторыі, захочуць самастойна абысці тэрыторыю, а магчыма і праслухаць успаміны ваеннапалонных, што начытваюць прафесійныя акцёры (цяпер вядзецца распрацоўка віртуальнай гісторыі і карты лагера). Такі падыход можна выкарыстоўваць на падобных аб'ектах па ўсёй Беларусі.

Калі мы прывыкаем да пэўнай інтэрпрэтацыі гісторыі, яна перастае адгукацца ў сэрцах. Да таго ж доўгі час мы ведалі толькі маўклівую гісторыю. Нам былі недаступныя задакументаваныя персаналізаваныя сведчанні. Сучасныя тэхналогіі дазваляюць «даць» голас нямым сведкам. І гэта не толькі расповед пра трагічныя падзеі. Вайна дала каласальны масіў інфармацыі пра тое, як людзі паводзяць сябе ў розных сітуацыях, праз што ім даводзіцца праходзіць. І гэта трэба ўлічваць пры развіцці культуры памяці, рэтрансляцыі, інтэрпрэтацыі падзей.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

Следства вядуць...

# КАЛІ ЗЛОДЗЕЙ МАЎЧЫЦЬ, ЗА ЯГО «ГАВОРАЦЬ» СЛЯДЫ

## Выкрыць злачынцу дапаможа трасалогія

**Банда рабаўнікоў, што «працавала» па ўсёй Беларусі, «трапілася» дзякуючы адбіткам спецыяльнай прылады, якой злодзеі адчынялі замкі ў памяшканнях, што абкрадалі. А забойцу дзвюх дзяўчын, які намагаўся даказаць, што гэта была самаабарона і гэта яны нападалі на яго з малатком, выдалі сляды таго самага малатка. Яны паказалі, што менавіта мужчына грукаў у дзверы пакоя звонку, каб дабрацца да ахвяр, а па яго тэорыі адбіткі павінны былі застацца ўнутры памяшкання. Такія доказы віны па следзе, які, дарэчы, можа быць пакінуты чым заўгодна, збіраюцца дзякуючы судовай трасалагічнай экспертызе. Што гэта такое і як выконваецца, расказаў Яўген ПЫРХ, дзяржаўны судовы эксперт Мінскага міжраённага аддзела Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз.**

### УВАГНУТАСЦІ І ДРАПІНЫ «АПІШУЦЬ» УЗЛОМ

Трасалогія — навука аб слядах — матэрыяльным адлюстраванні таго, што мае дачыненне да чалавека і яго наваколля. Гэта, пэўна, самы аб'ёмны аддзел крыміналістычнай навукі, які ўключае ў сябе некалькі раздзелаў судовых трасалагічных экспертыз. І задача судовага эксперта — зафіксаваць карціну на месцы здарэння і сабраць сляды, аб'екты ці рэчавыя доказы, якія маюць дачыненне да злачынства. Спосабы фіксавання і наступнай ідэнтыфікацыі адрозніваюцца, але штораз гэта доўгі карпатлівы працэс, расказаў эксперт.

— Замкі робяцца для сумленных людзей, а грабежніка ніводная запорная прылада не спыніць, калі ён ведае, што ўнутры ёсць чым пажывіцца, — заўважыў Яўген Пырх. — Аднойчы ў надзейных металічных дзвярах рабаўнікі прасвідравалі адтуліны, апусцілі ў іх «кошку» (прыстасаванне з шыпамі, з дапамогай якога залазяць на слупы), а другі канец гэтай прылады зачапілі за ліфт і адправілі яго на апошні паверх. Дзверы з кватэры з'ехалі разам з ліфтам.

На месцы крадзяжу ці пашкоджання маёмасці амаль заўжды можна знайсці сляды, пакінутыя прыладамі ўзлому. Пранікаючы праз акно ці дзверы, ускрываючы сейф, злодзей можа пакінуць на іх след свайго «ключа». Затрымаўшы чалавека, які, на думку следства, можа мець дачыненне да злачынства, пачынаецца судовая экспертыза, каб ідэнтыфікаваць, ці мог знойдзены след узлому быць пакінуты прадметам, які належыць меркаванаму злодзею.

— Першапачаткова даследуецца сам след, ці прыгодны ён для параўнання, а потым яго ўжо параўноўваюць з прыладай, знойдзенай у чалавека, — кажа эксперт. — Робіцца візуальнае параўнанне па форме і размерных характарыстыках. Калі гэтыя паказчыкі супадаюць, то пачынаецца экспертны эксперымент. Ён залежыць ад таго, дынамічны гэта след ці статычны. Судовы эксперт павінен максімальна дакладна ўзнавіць механізм следастварэння, які быў на месцы здарэння.

Статычны след (увагнутасць) можа застацца на прадмеце, які мае больш мяккую структуру, чым прылада ўзлому. Каб высветліць, ці пакінуты ён менавіта гэтай прыладай, судовы эксперт робіць на прадмеце эксперыментальныя сляды і глядзіць, ці маюцца ў іх такія ж прыкметы, як і ў слядах, знойдзеных на месцы злачынства. Калі яны супадаюць, можна казаць, што след пакінуты менавіта гэтай прыладай.

Даследуючы дынамічны след (фактычна, гэта драпіна), які застаецца на больш цвёрдай паверхні, судовы эксперт бярэ, напрыклад, свінцовую пласціну і драпае ёй паверхню, каб пакінуць след. Пасля пад мікраскопам ён параўноўвае пакінуты злодзеем след і той, што атрыманы эксперыментальным шляхам. Разоры драпін могуць адрозніваца па глыбіні, форме, шырыні. Аднак калі меркаваная прылада ўзлому вызначана правільна, то пры супастаўленні пад мікраскопам драпіна, пакінутая судовым экспертам, будзе працягам следу драпіны, пакінутай на месцы здарэння. Яны абедзве будуць складвацца ў трасу і быць нібыта працягам адна адной, растлумачыў Яўген Пырх:

— Прыладай узлому можа быць усё што заўгодна. Як спецыяльныя прыстасаванні, так і звычайны лом.

### АБУТАК І ШЫНЫ «РАСКАЖУЦЬ», ДЗЕ БЫЎ

Сына, што забіў бацьку і вывез у поле, каб спаліць, «здаў» след машыны, на якой ён перавозіў труп. На восях стаялі шыны розных вытворцаў, таму ўдалося ідэнтыфікаваць злачынцу па рысунку пратэктара. А паколькі спальваў ён цела ў антрэсолі, то па яе фрагментах з месца здарэння ўдалося даказаць, што яна была адным цэлым з шафай, якая стаяла ў хаце забойцы, падзяліўся гісторыяй судовы эксперт.

— Да падэшвы абутку прыліпае пыл ці іншы бруд з месца здарэння, які пасля выкрывае, дзе быў чалавек. Або наадварот, той прынясе яго з сабою ў памяшканне і натопча. Даследуючы след, судовы эксперт робіць эксперыментальныя адбіткі для параўнання з арыгіналам. Любы абутак падчас нашэння набывае характэрныя меткі, якія залежаць ад манеры хады яго гаспадара і нейкіх прыдбаных пашкоджанняў, якія дазваляюць пасля дакладна ідэнтыфікаваць пэўную пару абутку з пакінутым ёю адбіткам, — удакладніў Яўген Пырх.

Зачэпку для пошуку меркаванага злачынцы можа даць глыбіня следу — калі яго памер не адпавядае вазе носьбіта, значыць чалавек нешта нёс на сабе. А па ланцужку слядоў можна ўявіць, што іх гаспадар касалапы ці кульгае. Часта сляды абутку застаюцца і на машынах, на якіх спаганяюць злосць. А ў грамадзянскіх працэсах, здаралася, «прыносілі адбіткі» і на ўласным целе, атрымаўшы выспятка, каб паскардзіцца на сваю другую палавіну. Механізм даследавання следу ад аўто і магчымасці яго пошуку такія ж. Адбітак шыны раскажа пра ступень яе зношанасці, наяўнасць пашкоджанняў, від машыны (легкавая, грузавая) і іншае, распавёў судовы эксперт.

### АСКЕПКІ, КАВАЛКІ, КРУПІНКІ ЗБЯРУЦЦА Ў АДНО ЦЭЛАЕ

Аднаўленне цэлага па частках у судовай трасалагічнай экспертызе часта робіцца пасля ДТЗ. Механізм складання слядоў на месцы аварый вельмі складаны і аб'ёмны. Даследаванне тут праводзіцца комплексна, у звязцы з іншымі судовымі экспертамі: тэхнічнымі і судова-медыцынскімі. Што датычыцца судовай трасалагічнай экспертызы, яна займаецца слядамі, якія застаюцца на месцы здарэння: аскепкі фары, фрагменты бампера, крупінкі лакафарбавага пакрыцця, па якіх можна вызначыць машыну. Падчас судовай экспертызы высвятляецца, ці складалі гэтыя часткі адно цэлае з бамперам ці фарай на аўто, якое, мяркуецца, вінаватае ў здарэнні. Калі пазл складваецца — значыць, гэта яна, заўважыў Яўген Пырх.

Шмат расказаць пра ДТЗ можа і адзенне пацярпелых. Яно здольнае зачапіцца за аўто пры сутыкненні або слізгануць па паверхні машыны. Верхні слой адзення можа нават аплавіцца, бо за кароткі прамежак часу пры аварыі на яго ўздзейнічае значная сіла трэння і ціску. Быў выпадак, калі на куртцы









**Так след на глебе становіцца гіпсавым адбіткам.**

застаўся аплаўлены след ад рэменя бяспекі, настолькі моцна чалавека тузанула пры сутыкненні. А калі на пешахода наляціць аўто, якое нясецца на хуткасці больш за 70 кіламетраў у гадзіну, то ў выніку пацярпелы проста «разуецца»: абутак адляціць у адзін бок, цела — у другі. Шанцы выжыць пры гэтым практычна нулявыя, нагадаў спецыяліст.

### КАРЦІНА «НАМАЛЮЕЦЦА» АДЗЕННЕМ

Рысунак ад адзення, які застаецца як след на нейкім прадмеце на месцы крадзяжу, можа «расказаць», з якога матэрыялу выраблены прадмет адзення. Тканіна пакіне «карціну» ў выглядзе перапляцення квадрацікаў, а вязаныя рэчы «пакажуць» зусім іншы малюнак. У скураных вырабаў адбітак адрозніваецца ў залежнасці ад таго, з якой скуры зроблена адзенне. Дзякуючы гэтым адбіткам можна даць органам дазнання інфармацыю, каб звузіць кола пошукаў, апісаў Яўген Пырх:

— Адзенне, якое было на бандыце ў момант злачынства, можа мець пэўныя заводскія пашкоджанні ці сляды рамонту. Гэтыя меткі дапамагаюць устанавіць следаўтваральны прадмет — адзенне. Напрыклад, злачынец быў у тканых пальчатках, якія ён зацыраваў. Па такой метцы следу можна знайсці пальчатку, якой той быў пакінуты. Нават тонкія медыцынскія пальчаткі не бываюць абсалютна гладкія, а маюць пэўную структуру паверхні. У зоне пальцаў, напрыклад, каб больш зручна было трымацца, яны могуць мець пэўны рэльеф, так што верагоднасць пакінуць след вялікая. Наслядзіць увогуле можна любым адзеннем: курткай, шапкай, штанамі — часам дастаткова дакрануцца імі да паверхні сцяны, паліцы.

**Ірына СІДАРОК.**

**Фота дадзена Мінскім міжраённым аддзелам Дзяржкамітэта судовых экспертыз.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор** | ИП Субботницкий И. В. – ликвидатор ООО «Кроличья хатка» |
| **Продавец** | ООО «Кроличья хатка», УНП 391079061 |
| **Форма аукциона** | Торги проводятся в форме открытого аукциона |
| **Дата, место и время проведения аукциона** | Торги проводятся **15.11.2021 года.** **Начало аукциона – 16.00.** Место проведения: г. Минск, ул. Киселева, д. 38, помещение 11 |
| **Контактные данные** | тел. +37529 6669171, e-mail: igor_subb@mail.ru |

**Сведения о предмете торгов и начальная цена без учета НДС, BYN**

**Лот № 1.** Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 225/С-19235. Наименование: **Зерносклад.** Назначение: Здание специализированное сельскохозяйственного назначения, общая площадь 692,8 кв. м) – 43 600,00 руб.

**Лот № 2.** Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 225/С-19237. Наименование: **Зерноток.** Назначение: Здание специализированное сельскохозяйственного назначения, общая площадь 354,7 кв. м – 20 200,00 руб.

**Лот № 3.** Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 225/С-19236. Наименование: **Зернохранилище.** Назначение: Здание специализированное сельскохозяйственного назначения, общая площадь 413,3 кв. м – 23 200,00 руб.

**Лот № 4.** Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 225/С-19238 (Наименование: **Мехмастерские.** Назначение: Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), общая площадь 406,4 кв. м – 34 300,00 руб.

**Лот № 5.** Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 225/С-19239. Наименование: Навес. Назначение: Сооружение специализированное складов, хранилищ, общая площадь 854,1 кв. м. – 37 700,00 руб. Продавец является плательщиком НДС

Размер задатка, шаг торгов: 5 (пять) % от начальной цены предмета торгов по каждому лоту. Задаток перечисляется на расчетный счет ООО «Кроличья хатка»:
УНП 391079061, р/с BY38BAPB30124922300120000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, БИК BAPBBY2X. Сумма шага аукциона составляет 5 % от начальной цены предмета торгов

Сроки и порядок приема заявок: **заявления с необходимыми документами на участие в аукционе принимаются по адресу: 222304, Минская область, г. Молодечно, ул. Язепа Дроздовича, д. 3, оф. 10 или e-mail: igor_subb@mail.ru, в рабочие дни с 09.00 до 17.00 с 15 октября 2021 года по 12 ноября 2021 года включительно**

**Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ним.** Вышеуказанные объекты находятся на территории ООО «Кроличья хатка» по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, Бегомльский с/с, 3, 3/1, 3/2, 4, 4/1.
Ознакомиться с предметами торгов можно по месту их нахождения с 09.00 до 17.00 в рабочие дни, предварительно согласовав время с организатором торгов по тел. +375296669171

Документы, необходимые для участия в торгах.
К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, копию свидетельства о госрегистрации

Возмещение затрат: Победителем торгов (претендентом на покупку) возмещаются фактические затраты, связанные с их организацией и проведением в размере 1 % от стоимости лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) календарных дней после проведения аукциона

Срок оплаты: не более 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов. Результаты торгов по конкретному предмету подлежат аннулированию организатором торгов в случае, если победитель торгов уклоняется или отказывается от:
- подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам торгов;
- возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов;
- оплаты предмета торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов;
- государственной регистрации договора купли-продажи предмета торгов.
В случае аннулирования результатов торгов по указанным основаниям внесенный победителем торгов задаток не возвращается, а включается в состав имущества продавца

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **Государственное предприятие «Слава труду»** (УНП 500056012), 231482, Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Советская, 74а, тел./факс (01563) 30-1-95, в лице антикризисного управляющего частного предприятия «Правовой путь».

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **01 ноября 2021 г. 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

| № п/п | Предмет торгов, местонахождение | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 451/С-12440, административное здание, инв. № в б/у 890, Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Красноармейская, д. 12, общая площадь 216,6 кв. м | 23 859,02 |
| 2 | Погрузчик фронтальный «Амкодор» 320, инв. № 1018, 2009 г. в., Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Советская, 74а | 9 360,00 |

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 16.10.2021 г. 09.00 по 29.10.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 14 календарных дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 22.09.2021 г.

Утерянный договор страхования форма 2РП, 2РН серия БА № 1789557, страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

15 кастрычніка 2021 г. № 40 (625)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


МЯСЦОВЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

## САД ДОБРЫХ СПРАЎ НА ДОБРУШСКАЙ ЗЯМЛІ

На Гомельшчыне шмат прыкладаў, калі ініцыятыва вяскоўцаў дапамагае мяняць аблічча населеных пунктаў — талакой добраўпарадкоўваюць, азеляняюць, арганізоўваюць грамадскую прастору. Актыўна падтрымліваць падобныя ідэі і прапановы людзей, дапамагаць ажыццяўляць іх імкнуцца мясцовыя ўлады і дэпутаты Добрушскага раёна.

стар. 17



Юныя актывісты аграгарадка Леніна высадзілі імянныя яблынькі.

ПЛАН ДЗЕЯННЯЎ

## ЗРАБІЦЬ СТАЛІЦУ БОЛЬШ ПРЫВАБНАЙ,

### або Сумесны пошук аптымальных рашэнняў

**Сёлета на вясновай сесіі дэпутаты Мінскага гарадскога Савета прынялі План дзеянняў на бягучы год па навядзенні парадку на тэрыторыі сталіцы і зацвердзілі рэгіянальны комплекс мерапрыемстваў па ахове навакольнага асяроддзя і ўстойлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў. У пэўным сэнсе прамежкавыя вынікі гэтай работы дэпутаты Мінгарсавета абмеркавалі ў час нядаўняй сустрэчы з кіраўніцтвам Мінгарвыканкама, якая прайшла ў фармаце дыялогавай пляцоўкі.**



Фота minsknews.by

Паводле слоў старшыні гарсавета Андрэя Бугрова, сустрэча адбылася па ініцыятыве дэпутатаў, якую яны выказалі ў ходзе нядаўняй сесіі гарадскога Савета. Ідэя падалася слушнай старшыні Мінгарвыканкама Уладзіміру Кухараву. Галоўнай тэмай размовы стала абмеркаванне напрамкаў далейшага развіцця Мінска.

На сустрэчы былі закрануты многія актуальныя моманты гарадскога жыцця, ход выканання наказаў выбаршчыкаў. Пераважная частка пытанняў датычылася сферы будаўніцтва, укаранення комплекснага падыходу да капітальнага рамонту жылых дамоў, гаварылі пра перспектывы сістэмы аховы здароўя, магчымасці павелічэння аб'ёмаў узвядзення арэнднага жылля, узмацненне барацьбы з несанкцыянаваным гандлем, аднаўленне школьных стадыёнаў, далейшую рэканструкцыю некаторых участкаў набярэжнай Свіслачы, пашырэнне забеспячэння насельніцтва вадой з артэзіянскіх крыніц. Дэпутаты Мінгарсавета закранулі таксама тэму ўдасканалення арганізацыі дарожнага руху і мінімізацыі фактараў, якія спрыяюць узнікненню затораў пры выездзе са сталіцы.

стар. 8

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Сустрэчы ў Пецярбургу

**Парламенцкая дэлегацыя Беларусі на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай прыняла ўдзел у трэцім Еўразійскім жаночым форуме на тэму «Жанчыны: глабальная місія ў новай рэальнасці».**

На палях форуму адбылася сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталлі Качанавай са старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянцінай Матвіенка.

«Вельмі рада, што вы прыехалі. Гэта, паверце, вельмі важна ў цэлым для нашай супольнасці. Дарэчы, усе спікеры прыехалі, — сказала Валянціна Матвіенка. — Гэта важна і для краіны. Вы сёння выступілі ў такой аўдыторыі. І для СМІ, і для свету вельмі важнае ваша выступленне з аб'ектыўнай карцінай таго, што адбываецца, як вы гэта ацэньваеце». (Аб выступленні Наталлі Качанавай на форуме — на 3-й стар. «Звязды».)

Наталля Качанава падзякавала Валянціне Матвіенка за такую цудоўную ідэю аб'яднаць жанчын усяго свету ў вырашэнні глабальных праблем. «На жаль, іх менш не становіцца. З году ў год перад намі з'яўляюцца абсалютна новыя задачы, якія мы павінны вырашаць. І толькі разам мы можам сапраўды зрабіць так, каб нас пачулі», — дадала Наталля Качанава.

Таксама ў штаб-кватэры Міжпарламенцкай асамблеі СНД у Санкт-Пецярбургу Наталля Качанава правяла сустрэчу з намеснікам старшыні Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе Піа Каума.

## З выездам на месца

**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Анатоль Ісачанка і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы з выездам на месца разгледзелі зварот грамадзяніна.**

Да вывучэння яго пісьма былі запрошаны прадстаўнікі мясцовай выканаўчай улады Мінскага раёна. Сенатары ў ходзе сустрэчы з заяўнікам абмеркавалі ўсе абставіны і прычыны яго звароту па дапамогу ў верхнюю палату беларускага парламента. Пісьмо датычылася дадатковага выдзялення зямельнага ўчастка для вядзення прадпрымальніцкай дзейнасці асобам з інваліднасцю.

Былі дадзены адпаведныя даручэнні па ўрэгуляванні сітуацыі.

## Пасябруюць з правінцыямі Кітая

**Маладзёжны парламент пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь плануе развіваць супрацоўніцтва з правінцыямі Кітая.**

Пра гэта ішла гаворка старшыні Маладзёжнага парламента Ягора Макарэвіча падчас сустрэчы з генеральным дырэктарам платформы інтэграцыі міжнародных эканамічных і гандлёвых рэсурсаў «Хопінг Чайна», афіцыйным прадстаўніком Дэпартамента прамысловасці і інфарматызацыі правінцыі Шаньдун КНР Чжан Уі.

## Чысты лес сваімі рукамі

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, начальнік Гомельскай мытні Фелікс Яшкоў узяў удзел у рэспубліканскай акцыі «Чысты лес», прымеркаванай да Года народнага адзінства.**

Работнікі Гомельскай мытні і сябры пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» Гомельскай мытні актыўна працавалі на ачыстцы лесу і пасадцы саджанцаў дрэў на тэрыторыі Каранёўскага лясніцтва Гомельскага доследнага лягаса.

На думку сенатара, пасадзіць дрэва сваімі рукамі — гэта добрая, патрэбная і важная справа ў жыцці кожнага чалавека і малая частка таго, што мы можам зрабіць для захавання і павелічэння лясных багаццяў краіны.

# ЗРАБІЦЬ СТАЛІЦУ БОЛЬШ ПРЫВАБНАЙ


Фота minsknews.by

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 7-й стар.)*

На думку Андрэя Бугрова, такая форма работы дэпутацкага корпуса з мясцовай уладай з'яўляецца эфектыўнай, прынятыя рашэнні, дадзеныя даручэнні пойдуць мінчанам толькі на карысць. Кіраўніцтва мясцовай улады горада з павагай ставіцца да дзейнасці дэпутацкага корпуса сталіцы. Старшыня гарвыканкама Уладзімір Кухараў імкнецца абавязкова прысутнічаць на сесіях гарадскога Савета, заўсёды прыслухоўваецца да меркавання дэпутатаў, гаворыць Андрэй Бугроў.

## «Зялёны» працяг

У гэтыя восеньскія дні ўвага і сілы прадстаўнікоў як вертыкалі ўлады горада, так і дэпутатаў засяроджаны на пытаннях добраўпарадкавання і ўтрымання гарадскіх тэрыторый. Было вырашана праверыць стан месцаў, дзе летам і на пачатку восені праводзіліся земляныя работы. Дадзена даручэнне высветліць, у якой ступені зроблена аднаўленне парушаных земляных пластоў, добраўпарадкаваныя канкрэтныя ўчасткі. А ўвогуле пастаўлена задача планавыя рамонты падземных камунікацый закончыць да 15 кастрычніка.

Не без уплыву дэпутатаў у сталіцы працягваецца рамонт асобных дваровых праездаў і знешніх вулічных лесвіц, якія з цягам часу прыйшлі ў заняпад. На іх аднаўленне з гарадскога бюджэту выдзелены дадатковыя сродкі. Дарэчы, пра нездавальняючы стан такіх аб'ектаў мінчане могуць паведаміць у раённыя службы ЖКГ. Мясцовыя ўлады такім чынам імкнуцца ўлічваць меркаванне гараджан падчас прыняцця рашэнняў, якія закранаюць іх інтарэсы па месцы жыхарства.

Аднасна нядаўна непадалёку ад парку «Дзівіелька» распачалі добраўпарадкоўваць тэрыторыю: праклалі пешаходныя дарожкі, якія вядуць і да музея пад адкрытым небам з ваеннай тэхнікай, уздоўж сцяжынак паставілі лаўкі, заклалі алею дрэў у гонар сталічных ратавальнікаў і г. д. Цяпер там па прапанове мінчан маркуецца пабудаваць яшчэ і спартыўную спецыялізаваную пляцоўку для катання на скейтбордах.

Адно з актуальных пытанняў — працяг добраўпарадкавання гарадскіх тэрыторый, далейшае азеляненне жылых кварталаў і вуліц, у тым ліку і новых. Яны штогод з'яўляюцца на карце сталіцы. Вось і сёлета іх ужо некалькі. Там побач з дамамі і ўздоўж гарадскіх артэрый з'явяцца саджанцы дрэў і дэкаратыўных кустоў. Увогуле, гэтай восенню высадзяць звыш 270 тысяч кустоў, у тым ліку ўздоўж МКАД і іншых транспартных артэрый. Дэпутаты мяркуюць прыцягнуць да гэтых работ навучэнцаў сталічных ВНУ.

Між іншым, досвед мінчан у справе маштабнага азелянення гарадскіх тэрыторый варты пераймання. Напрыклад, гэтыя сезонныя работы ўзгадняюцца таксама і з супрацоўнікамі інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі і Цэнтральнага батанічнага саду. Дзякуючы іх парадам і рэкамендацыям у Мінску вызначыліся з тым, якія дрэвы і кусты будуць сябе лепш адчуваць на нярэдка загазаваных вуліцах сталіцы, хутчэй прыстасуюцца да гарадскога асяроддзя, змогуць лепш супрацьстаяць уплыву проціғалалёдных рэагентаў. У ліку найбольш жыццяздольных раслін навукоўцы назвалі барбарыс, ясень, вяз, чырвоны дуб і некаторыя іншыя.

## Пакіньце свой водгук!

Таксама варты пераймання ў рэгіёнах і досвед па рэалізацыі праекта «Зялёны двор разам!». На яго сайце можна даведацца аб канструктыўным узаемадзеянні мясцовай улады і мінчан, якія жадаюць зрабіць сталіцу больш зялёнай і прывабнай. Так, жыхары мікрараёнаў могуць пакінуць заяўкі на пасадку дрэў і кустоў у дварах і, як і раней, разлічваць на дапамогу гарадскіх службаў. На сайце можна азнаёміцца з пералікам участкаў для азелянення, нешта прапанаваць самому, атрымаць інфармацыю аб пасадачным матэрыяле, відах азелянення і г. д.

Важны момант: сёлета на сайце з'явіўся асабісты кабінет карыстальніка. Што ён дае? У ім можна пакінуць водгук ці каментарый аб практыцы азелянення ў раёне, атрымаць нават прыз і заахвочванне ад Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама. Прэтэндэнту на ўзнагароду варта зарэгістраваць асабісты кабінет карыстальніка на сайце, паўдзельнічаць у азеляненні, сфатаграфаваць яго вынікі і размясціць гэту фотасправаздачу ў асабістым кабінеце. Трохі лічбаў. За час існавання праекта «Зялёны двор разам!» яго ўдзельнікі пасадзілі на прыдомавых тэрыторыях каля 40 000 дрэў і амаль 240 000 кустарнікаў.

Калі яшчэ тая вясна наступіць... А ў Мінску ўжо пачалі да яе рыхтавацца!

У 2022 годзе ва ўсіх раёнах сталіцы істотна палепшаць кветкавае афармленне галоўных і так званых каркасных вуліц, будуць нававедзенні і ў вертыкальным азеляненні, яно стане больш сучасным і прывабным дзякуючы зменам у канструкцыях вазонаў і кашпо. Таксама далейшае афармленне з выкарыстаннем кампазіцый з дэкаратыўных кустоў чакаюць МКАД, транспартныя развязкі, уезды ў горад, раздзяляльныя палосы. Увогуле, у кветкавым афармленні вуліц і паркаў акцэнт будзе зроблены на шматгадовыя расліны.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

❍ У тэму

## Фактар асабістага прыкладу

**У Мінску ў мінулыя выхадныя адбыліся маштабныя суботнікі па добраўпарадкаванні і масавым прыбіранні паркаў і сквераў, двароў у жылых кварталах, азеляненні тэрыторы ўздоўж МКАД, іншых магістраляў і вуліц. Разам з тысячамі мінчан у рабоце па навядзенні парадку актыўна ўдзельнічалі прадстаўнікі мясцовай улады сталіцы.**

Дэпутаты Мінскага гарадскога Савета на чале з яго старшынёй Андрэем Бугровым наводзілі чысціню ў Аляксандраўскім скверы. Старшыня гарвыканкама Уладзімір Кухараў разам з калегамі займаўся азеляненнем транспартнай развязкі МКАД і вуліцы Кіжаватава. Не адставалі ад іх кіраўнікі і прадстаўнікі ўсіх адміністрацый раёнаў сталіцы, работнікі прадпрыемстваў, ведамстваў, арганізацый, студэнты вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Фактар асабістага прыкладу адыграў не апошнюю ролю ў масавым удзеле мінчан у суботніках. Тысячы гараджан, якія ўзброіліся рыдлёўкамі, граблямі і іншым інструментам, шчыравалі на шматлікіх аб'ектах у розных раёнах сталіцы. Мінчане пасадзілі тысячы новых кустоў, а на ранейшых пасадках зрабілі санітарную выразку сухіх і пашкоджаных галінак, дзе-нідзе пафарбавалі малыя архітэктурныя формы, якія звычайна размяшчаюць у месцах масавага адпачынку.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**

РАЗАМ

# Тое, што нам трэба

**У Жодзіне прайшла 10-я сустрэча гарадоў-пабрацімаў Беларусі і Расіі. Адным з яе галоўных арганізатараў стаў старшыня Савета старэйшын пры прэзідыуме Савета Рэспублікі Барыс БАТУРА.**

Можна сказаць, што на яго плечы лёг асноўны цяжар па падрыхтоўцы гэтай юбілейнай сустрэчы. Барыс Батура ўжо не першы год з'яўляецца таксама старшынёй праўлення беларускай грамадскай арганізацыі «Парodненыя гарады». Прычым на грамадскіх пачатках. Можна ўявіць, колькі арганізацыйных пытанняў, вялікіх і не вельмі праблем прыйшлося вырашаць падчас падрыхтоўкі гэтай у пэўным сэнсе гістарычнай падзеі.

Спікер верхняй палаты парламента Наталля Качанава накіравала прывітанне ўдзельнікам сустрэчы. Яна, у прывітанні, адзначыла, што ў аснове Саюза Беларусі і Расіі ляжыць пачуццё братняга яднання народаў дзвюх краін, шматвякавы вопыт сумеснай гісторыі. А гэта такія яркія старонкі, як наша агульная Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, наступнае аднаўленне ў пасляваенны перыяд разбуранай эканомікі, дасягненне небывалых вышынь у навуцы і культуры.

У прывітанні гаворыцца і аб тым, што Беларусь падтрымлівае гандлёва-эканамічныя адносіны больш чым з 80 рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі. Штогод пад эгідай Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі з удзелам прэзідэнтаў нашых краін праводзіцца Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Такі знакавы сумесны праект з'яўляецца найбуйнейшай перагаворнай пляцоўкай для абмеркавання актуальных пытанняў рэгіянальнага ўзаемадзеяння па стратэгічна важных кірунках.

У сустрэчы ўдзельнічалі дэпутаты Саветаў розных узроўняў, сенатары, кіраўнікі многіх органаў мясцовай улады. Атмасфера і канструктыўная работа ў час пленарнага пасяджэння і ў секцыях, безумоўна, паспрыяе далейшаму пашырэнню партнёрскага ўзаемадзеяння паміж гарадамі-пабрацімамі, лічаць расійскія госці.

У сваю чаргу Барыс Батура звярнуў увагу на тое, што гэта сустрэча — сімвал адзінства і дружбы паміж расійскім і беларускім народамі. Сёння неабходнасць іх дыялогу значна павялічваецца. Таму згуртаванасць, узаемадапамога і ініцыятыва — тое, што нам вельмі патрэбна. Невыпадкова ў Жодзіне беларусы і расіяне таксама абмеркавалі і сумесныя дзеянні па супрацьстаянні замежным санкцыям.

**Леанід ТУГАРЫН.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

**На сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў ішла гаворка пра будаўніцтва. Пытанні ўзвядзення жылля, а таксама дзіцячых садкоў, школ, паліклінік і іншых аб'ектаў сацыяльнага прызначэння традыцыйна ў цэнтры ўвагі народных выбраннікаў.**

Дзяржаўная праграма жыллёвага будаўніцтва рэалізоўваецца кожную пяцігодку, згодна з рашэннем «абласнога парламента». Таму вырашэнне кватэрнага пытання знаходзіцца на асаблівым кантролі.

Усяго за пяць гадоў у Падзвінні запланавалі здаць пад ключ каля 1,8 мільёна квадратных метраў жылля. Паводле слоў **старшыні камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Віцебскага аблвыканкама Аляксандра ШЫДЛОЎСКАГА,** гэта прыкладна на 400 тысяч «квадратаў» больш, чым у 2016—2020 гады.

У паўночнай вобласці краіны, дзе колькасць насельніцтва больш за 1 мільён 120 тысяч чалавек, у спісах тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — парадку 64 тысяч, у тым ліку прыблізна 27 тысяч — віцябчан. А сярод апошніх пераважна 15 тысяч маладых сем'яў, якія выхоўваюць па адным дзіцяці.

Напэўна, калі ідзе размова пра новыя мікрараёны Віцебска, у першую чаргу згадваецца назва Чарамушкі. Чаромушкі, як і мікрараёны Нікраполле, Тарны і Лучоса, на працягу пяці гадоў будуць актыўна забудоўваць шматпавярховымі дамамі. Кіраўніцтва гарвыканкама разумее, што трэба паклапаціцца, каб у найбліжэйшай перспектыве тутэйшыя жыхары маглі атрымаць комплекс аб'ектаў сацыяльнага прызначэння. Таму будзе прадумана магчымасць паралельнага будаўніцтва дзіцячых садкоў і іншай інфраструктуры.

Паводле інфармацыі Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Віцебскай вобласці, толькі ў студзені — ліпені арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 1,5 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 133 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля.

Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 48,5 тысячы квадратных метраў, або 36,4 % ад усяго аб'ёму пабудаванага.

У сельскіх населеных пунктах, як сведчаць работнікі статыстыкі, уведзена ў эксплуатацыю 37,6 тысячы квадратных метраў — 28,3 % ад агульнага ўводу па вобласці.

Цікава, што ў глыбінцы ўжо няма неабходнасці масава ўзводзіць шматпавярховае жыллё. У такіх раённых цэнтрах, як Ушачы, Расоны, Шуміліна, у бягучай пяцігодцы ўзводзіць жыллё будуць раз на некалькі гадоў, а ў некаторых рэгіёнах будуць дастаткова будаваць індывідуальнага жылля.


У адным з новых спальных мікрараёнаў Віцебска — Білева.

Кіраўніцтва абласной прадстаўнічай і выканаўчай улад патрабуе больш увагі ўдзяляць будаўніцтву арэнднага жылля. Актуальная тэма — будаўніцтва дамоў, дзе падагрэў вады і ацяпленне — ад электрычнасці.

Дзеля аптымальнай нагрузкі будаўнічых арганізацый, лічаць у аблвыканкаме, мэтазгодным будзе больш актыўна прапаноўваць паслугі ў суседніх рэгіёнах Расійскай Федэрацыі. Віцебшчына мяжуе на ўсходзе са Смаленскай, на поўначы — з Пскоўскай абласцямі. Вопыт працы назапашаны немалы.

На сёння ў асноўным заключаны шэраг дагавораў падраду на ўзвядзенне шматкватэрнага жылля ў канструкцыях буйнапанэльнага домабудавання з прычыны яго больш даступнага кошту, а таксама на аказанне архітэктурных і інжынерных паслуг. Гэта — жыллё ў Смаленску, Калузе, Вялікіх Луках, выкананне будаўніча-мантажных работ у Ленінградскай вобласці і г. д.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**
**Фота аўтара.**

## У чаканні прэм'ер

# ПЛАНЫ НОВАГА ТЭЛЕСЕЗОНА

**Стартам новага вяшчальнага сезона Белтэлерадыёкампаніі сёлета можна лічыць гучную прэм'еру талент-шоу «X-Factor у Беларусі», якая адбылася ў мінулыя выхадныя. Аднак наперадзе аўдыторыю чакае яшчэ шмат цікавага кантэнту ў эфіры тэлеканалаў медыяхолдынга.**




Акрамя згаданага шоу, на «Беларусь 1» працягваецца паказ мастацка-публіцыстычнага цыкла «Партызанскі рубеж», у аснову якога ляглі сведчанні народнага супрацьстаяння на акупаваных нямецка-фашысцкімі захопнікамі беларускіх землях. Новымі серыямі папоўняцца ўжо вядомыя праграмы тэлеканала «Адзін дзень», «Маршрут пабудаваны», «Скажынемаўчы», «Сэнс жыцця» і іншыя. А журналісты Агенцтва тэленавін прадставяць гледачам новыя праекты, тэматычныя рубрыкі і ток-шоу. У абноўленым фармаце працягне выхад інфармацыйна-аналітычная праграма «Галоўны эфір». Эфір «Беларусь 2» папоўніцца прэм'ернымі праектамі, сярод якіх, напрыклад, інтэлектуальна-забаўляльны «Усёй сям'ёй». Варта чакаць і новых выпускаў вiктарыны «Вежа», кулінарнага шоу «На тыдзень» і г. д. У сваю чаргу спартыўны тэлеканал «Беларусь 5» дапоўніць сетку вяшчання інтэлектуальна-забаўляльным шоу «Гульня галавой», героі якога будуць адказваць на каверзныя пытанні вядучага Генадзя Вайтовіча. У планах таксама трансляцыі новага спартыўнага сезона па фігурным катанні, біятлоне. Працягваецца работа над праектамі, якія гледачы ўбачаць у час зімовай Алімпіяды ў Пекіне. Не пераключайцеся, кажуць, будзе цікава.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ
**(«Звязда»)** Выпуск № 150

**З 4 да 9 кастрычніка ў К'янчана-Тэрме (Італія) праходзіў камандны чэмпіянат Еўропы па шашках-100. У праграме спаборніцтвы ў класічнай, маланкавай і хуткай гульні.**

Жаночая каманда Беларусі (Вольга Федаровіч, Вікторыя Нікалаева, Паліна Петрусёва) перамагла ў класічнай праграме і ўзяла яшчэ дзве «бронзы» ў маланкавай і хуткай гульні.

№ 115



**№ 115 В. Кручкоў — NN**

**Белыя простыя шашкі:** a1, c1, e1, d2, h2, c3, e3, d4, h4, a5 (10)

**Чорныя простыя шашкі:** b4, b6, f6, h6, a7, c7, b8, d8, f8, h8 (10)

Майстар па шашачнай кампазіцыі Валерый Кручкоў (Украіна) задае пытанне. Ці можна белым гуляць 1. ab2? альбо 1. ef2?

Наступная пазіцыя, прапанаваная Валерыем, мае шмат камбінацыйных ідэй.

**№ 116 NN — В. Кручкоў**

**Белыя простыя шашкі:** c1, e1, f2, a3, c3, g3, f4, h4 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** a5, b6, d6, h6, c7, e7, g7, f8 (8)

1. cd4 dc5? (Прайграе, трэба было гуляць 1...gf6 з пагрозай 2...bc5, 3...de5, 4...hh2). У белых ёсць камбінацыя, пакажыце яе.

2. fe3 gf6, а цяпер камбінацыя, знайдзіце яе.

Наступныя кампазіцыі складзеныя вядучым аддзела.

**№ 117**

**Белыя простыя шашкі:** a1, g1, d2, e3, d4, h4, c5, h6 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** f2, h2, a5, e5, f6, c7, g7, f8, h8 (9)

№ 118

**Белыя простыя шашкі:** b2, d2, d4, h6, a7 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, b4, h4, d6, g7, f8 (6)

№ 119

**Белыя простыя шашкі:** g1, b2, d2, e3, g3 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, e5, g5, d6, g7 (5)

**№ 120**

**Белыя простыя шашкі:** 49, 45, 37, 39, 31, 32, 33, 28, 22 (9)

**Чорныя простыя шашкі:** 26, 30, 23, 18, 19, 20, 13, 10, 2 (9)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваны.

**Выпуск № 149 ад 01.10.21.**

№ 109 1. g3-h4 f6-e5 2. h4-g5 e5:g3 3. e3-f4 g3:e5 4. g5-f6 b6-a5 5. f6:h8 f8-e7 6. h8:b6 a5:c7 7. h6-g7 e7-f6 8. g7:e5 d6:f4 9. g1-f2 (ЧПР 9. a3-b4+ знайшоў С. Бурко) c7-d6 10. a3-b4 a7-b6 11. b4-c5 b6:d4 12. f2-e3 f4:d2 13. e1:c7+.

№ 110 1. f4-e5 d6:h2 2. f2-g3 h2:f4 3. b4-c5 b6:f2 4. d2:b4 a5:c3 5. e1:g7 h6:f8 6. h4:d2+

№ 111 1. h2-g3 f4:h2 2. f2-g3 h2:f4 3. b4-c5 b6:f2 4. d2:b4 a5:c3 5. e1:g7 f8:h6 6. h4:d2 h6-g5 7. d2:h6+

№ 112 1. f4-g5 a3:c5 2. g5:e7 d8:f6 3. d4:g5 h4:f2 4. g1:e3 g7-f6 5. e3-f4+

№ 113 1. 42-38 43:23 2. 10-04 36:47 3. 04:40 47:45 4. 07-01 45:07 5. 01:12+

№ 114 1. 43-38 32:43 2. 48:30 37:48 3. 18-12 07:29 4. 16:07 48:25 5. 09-04 25:09 6. 04:08 05:32 7. 07-01 03:12 8. 01:26+

Першыя дакладныя адказы даслалі С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Рашэцін (Ашмяны).

**Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013.**

E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА,**
**майстар спорту.**





## Сядзі і глядзі

# Балет і яго героі на «Беларусь 3»

**Сусветны дзень балета — свята, што ўслаўляе шырока распаўсюджаны від сцэнічнага, музычна-харэаграфічнага мастацтва, сёлета адзначаецца 19 кастрычніка. І сацыякультурны тэлеканал на наступным тыдні прысвячае гэтай падзеі тэматычны эфір. Гледачам запрапануюць бліжэй пазнаёміцца з галоўнай установай акадэмічнага балета нашай краіны — Вялікім тэатрам Беларусі, яго салістамі і спектаклямі. У прыватнасці, адбудзецца паказ спектакляў «Баядэрка» і «Ганна Карэніна».**



Традыцыйна без інфармацыйнай падтрымкі і ўвагі аб'ектываў тэлекамер спецыялізаванага канала не застаюцца пастаноўкі тэатральных устаноў краіны, не выключэнне і Вялікі тэатр Беларусі. Артысты ўстановы — заўсёды пачэсныя госці студыі і героі праграм. З нагоды балетнага свята «Беларусь 3» далучаецца да сусветнай культурнай ініцыятывы — арганізоўвае знаёмства гледачоў анлайн ці ў тэлеэфіры з найлепшымі нацыянальнымі спектаклямі, тэатрамі і артыстамі.

**15.20** «Біблейскі сюжэт».
**15.50** «Белая студыя».
**16.35** «Аптымісты». Серыял.
**17.30** «Трэба жыць, каб усё перажыць». Дак. фільм [СЦ].
**17.55, 1.45** Піяністы XXI стагоддзя.
**18.40** Прыступкі цывілізацыі [СЦ].
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Сімфанічны раман». Серыял [СЦ].
**21.30** Улада факта.
**22.15** «Аптымісты». Серыял.
**23.10** «Фотасферы». Серыял [СЦ].
**0.00** «Тры дні з жыцця Ганны Балейн. Арышт, суд і пакаранне смерцю». Дак. фільм [СЦ].
**2.30** Раман у камені.

## Настальгія

**6.00** «СеваАлогія» (18+).
**6.50, 8.50, 9.40, 11.00, 12.55, 15.40, 17.00, 21.40, 23.00, 0.55, 3.40** Музычная настальгія (12+).
**7.00** Маст. фільм «Алмазы шаха» (18+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 00.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» (18+).
**13.10** Маст. фільм «Спаведзь палюбоўніцы» (18+).
**14.40** Канцэрт гурта «Пушкинг» (12+).
**18.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**19.00** Маст. фільм «Паветраныя піраты» (16+).
**20.20** Канцэрт гурта «Пикник» (12+).
**1.20** «Навагодні паказ» (12+).
**2.20** «Блеф-клуб» (16+).
**3.50** Маст. фільм «Дзесяць негрыцянят» (18+).

## EuroSport 1

**0.30** Веласпорт. «Тур Ламбардыі». Мужчыны (16+).
**2.30, 3.00, 7.00** Горныя лыжы. ЧМ. Карціна-д'Ампецца. Жанчыны. Слалам-гігант (16+).
**4.00, 8.00, 18.00** Трэкавы веласпорт. Чэмпіянат Еўропы (16+).
**6.00, 9.30** Тэлечасопіс «Зала славы: Солт-Лэйк-Сіці-2002» (16+).
**10.30** Тэлечасопіс «Зала славы» (16+).
**11.30, 16.30, 17.00** Горныя лыжы. ЧМ. Карціна-д'Ампецца. Мужчыны. Слалам-гігант (16+).
**12.30** Тэлечасопіс Cycling Show (16+).
**13.00, 17.30** Веласпорт. «Парыж — Рубэ». Мужчыны (16+).
**14.30** Лёгкая атлетыка. Бостанскі марафон (16+).
**18.55** Тэлечасопіс Cycling Show (16+).
**19.25, 22.50** Навіны (16+).
**19.30** Трэкавы веласпорт. Чэмпіянат свету. Рубэ. Першы дзень.
**22.55, 23.35** Горныя лыжы. ЧМ. Карціна-д'Ампецца. Мужчыны. Слалам-гігант (16+).

## Кінакамедыя

**0.55** «Халоп» (12+).
**3.00** «Дзікая парачка» (16+).
**4.50** «Дрэнны Санта» (16+).
**6.30** «2 + 1» (16+).
**8.40** «Мужчына з гарантыяй» (16+).
**10.20** «Выпадковы муж» (16+).
**11.55** «Мача і батан-2» (16+).
**14.00** «Як займацца каханнем па-англійску» (18+).
**15.50** «Без пачуццяў» (16+).
**17.35** «Ходзяць чуткі» (12+).
**19.30** «Эвалюцыя» (12+).
**21.20** «Даспехі Бога: аперацыя «Ястраб» (12+).
**23.20** «Лёгкі на ўспамін» (12+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.20** «Ганна-дэтэктыў» (16+).
**9.25** «Перыскоп» (16+).
**9.50** «Каралёк — птушачка пеўчая». Серыял (16+).
**11.40** «Знакі лёсу» (16+).
**12.15, 18.10, 3.35** «Сляпая» (16+).
**13.20, 19.20** «Варажбіткa» (16+).
**14.25** «Старац» (16+).
**15.05** «Містычныя гісторыі» (16+).
**16.10** «Пятая варта». Серыял (16+).
**20.35** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**23.20** «Фантом» (16+).
**0.30** «Лінія абароны» (16+).
**1.10** «Патрашыцелі» (16+).
**3.05** «Знакі лёсу» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.15, 18.05** Доктар Хаус (16+).
**6.30** Штучны розум (12+).
**9.05** Грань будучыні (12+).
**11.05** Аблівіён (16+).
**13.25** Клятва (12+).
**15.15** Жонка вандроўцы ў часе (16+).
**19.00** Мільянер паняволі (12+).
**20.40** Кіраванне гневам (12+).
**22.35** Без тармазоў (16+).
**0.15** Маёр Пэйн (12+).
**1.55** Клуб аматараў кніг і пірагоў з бульбяных ачысткаў (18+).
**3.55** Сталёвыя магноліі (6+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.25, 9.55** Пра што гавораць мужчыны (16+).
**8.05** Пра што яшчэ гавораць мужчыны (16+).
**11.35** Шчасце ў канверце (12+).
**13.25** Адзін удых (12+).
**15.15** На вастрыі (12+).
**17.15** Тры волаты і Марскі цар (6+).
**18.40** Тры волаты і прынцэса Егіпта (6+).
**20.00** Золушка (16+).
**21.35** Палі! (12+)
**23.30** Каралева (12+).
**1.05** Хандра (16+).
**2.50** Белы снег (6+).

## National Geographic

**6.00** Гульні розуму (16+).
**6.35** Машыны: разабраць і прадаць (16+).
**7.20, 13.20, 14.10, 17.35** Аўта-SOS (16+).
**8.15, 13.20, 16.45** Ледзяная дарога (16+).
**9.05** Самыя лепшыя суперкары (16+).
**10.00** Рыбы-пачвары (16+).
**10.50, 21.00, 3.15** Дзікі тунец (16+).
**11.40, 21.50** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**15.05** Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія і Перу (16+).
**15.55** Злавіць кантрабандыста (16+).
**18.25, 18.50** Фабрыка ежы (16+).
**19.15, 20.05** Расследаванне авіякатастроф (16+).
**22.35** Закінутыя гарады з Альбертам Лінам (16+).
**23.30** Падымаецца бура (16+).
**0.15** Аляска: новае пакаленне (16+).
**1.00** Непакорлівы востраў (16+).
**1.45** Ліхтугі за мяжой (16+).
**2.30** Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
**4.00, 4.45** Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
**5.35** Навуковыя глупствы (16+).

## Discovery

**8.00, 10.15, 10.40, 21.15, 21.40, 1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04, 7.35** Як гэта ўладкавана? (12+)
**8.25, 11.10, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**9.20, 9.45, 20.20, 20.45** Склады: бітва ў Канадзе (16+).
**12.05** Астранаўты-аматары (12+).
**13.00** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**13.55, 14.50, 15.45** Найлепшы збройнік (16+).
**17.35** Касмічныя забойцы (16+).
**18.30, 18.55** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
**19.25, 4.27** Хуткія і гучныя (12+).
**23.05, 5.14** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**0.55, 6.48** Сысці ад пагоні (16+).

*У прagраме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансліюецца са скрытымі субцітрамі.*

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** [СЦ], **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.00** Зона Х (16+).
**9.10, 21.45 Серыял «След» (16+).**
**10.50** «Скажынемаўчы».
**11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «У палоне ў мінулага» (16+).**
**14.00** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**14.45, 15.25 Драма «Акварэлі» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**23.40** Сфера інтарэсаў.
**0.20** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 17.55** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.10, 0.30** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.15, 22.00 Серыял «Следчы Гарчакова» (16+).**
**13.30 «Сямейныя гісторыі». Драма (16+) [СЦ].**
**14.00, 21.20 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).**
**15.00** «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**17.00** «Вежа» (12+).
**18.00** «Арол і рэшка. Дзяўчаты» (16+).
**19.00 «Клон». Серыял (16+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 19.40, 23.30** Навіны культуры.
**8.25, 18.00 «Ліквідацыя». Серыял (16+) [СЦ].**
**10.00** «Зэльдовіч. Тэорыя гарэння і выбуху». Гістарычны фільм (12+) [СЦ].
**10.45, 16.05 «Дзяўчынка з горада». Маст. фільм (6+) [СЦ].**
**12.20** «Беларуская кухня».
**12.50** «Камертон».
**13.15, 21.05 «Той самы Мюнхгаўзен». Маст. фільм (6+).**
**15.35** «Крылы Перамогі».
**15.50** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**17.20** «Люблю і памятаю».
**20.00** «Сваімі словамі».
**20.40** «Калыханка» (0+).

## Беларусь 5

**7.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Зальцбург» (Аўстрыя) — «Вольфсбург» (Германія).
**9.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Бенфіка» (Партугалія) — «Баварыя» (Германія).
**11.00** Тэніс. ВТА. Кубак Крамля.
**17.20** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Шахцёр» (Салігорск).
**19.40** Футбол. Ліга Еўропы. «Бетыс» (Іспанія) — «Баер» (Германія).
**21.50** Футбол. Ліга Еўропы. Анлайн гульнявога дня.

## АНТ

**6.00, 7.15, 8.15, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.00** Нашы навіны.
**7.10, 8.10** «Трывожная кнопка» (16+).
**9.10** «Аб'ектыўНа» (16+).
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 23.05 Фільм «Дзіця на мільён» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.15** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**21.55 Фільм «Алібі» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.05** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**10.00** «Глядзець усім!» (16+)
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.25, 20.45, 0.55** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.35, 21.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.25, 16.50 «Па законах ваеннага часу-3». Серыял (12+).**
**20.15, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Цырк».**
**5.10 Серыял «Мама-дэтэктыў» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 2.00, 3.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10, 22.15 Серыял «Мама-дэтэктыў» [СЦ] (16+).**
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 18.00** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.20** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.00** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25** «Гульня ў кіно» (16+).
**20.15** «Слабае звяно» (16+).
**21.15** «Назад у будучыню» (16+).
**1.30, 3.35** «Еўразія. Спорт» (16+).
**1.45** «Культ асобы» (16+).
**2.15, 3.15** Мір. Меркаванне (16+).
**2.30** Спецыяльны рэпартаж (16+).
**2.40** «Даслоўна» (16+).
**2.50** «5 прычын застацца дома» (16+).
**3.30** «Еўразія ў трэндзе» (16+).
**3.45 Маст. фільм «Блізняты» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35, 14.35 Серыял «Таямніцы следства» (16+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.40** «Кропкі над і» (16+).
**17.15** «60 хвілін» (12+).
**18.30** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Таямніца Ліліт» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.10, 8.20, 16.20, 19.40, 22.05, 23.15** Сёння. Галоўнае.
**6.10** Спорт-мікс.
**6.20** «Здароўе» (12+).
**7.25** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** Сфера інтарэсаў.
**8.50, 22.10** «НЗ.by».
**9.15** Гісторыі выратавання (12+).
**9.50, 10.25 Серыял «Званар» (16+).**
**11.10 Серыял «Ляснік» (16+).**
**13.20** Надзвычайнае здарэнне.
**13.50, 16.30 Серыял «Чужы раён» (16+).**
**16.55** «За гранню» (16+).
**17.55** «ДНК» (16+).
**19.55 Серыял «Балабол-5» (16+).**
**22.30, 23.30 Баявік «Гром лютасці» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 14.10, 16.45, 21.10, 1.05** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 14.15** Мультпарад (6+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Флэш» (12+).**
**8.20 Серыял «Зорны шлях» (12+).**
**9.00, 14.30 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).**
**9.45 Серыял «Бразілія» (12+).**
**10.30 Камедыя «Плезантвіль» (12+).**



**12.35 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**14.25** «Хачу ў Парыж» (12+).
**15.15 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).**
**16.50 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).**
**17.15** «7 цудаў».
**17.55 Серыял «Бярозка» (12+).**
**19.40 Серыял «Мейр з Істаўна» (18+).**
**20.55** «Вечарніца» (0+).
**21.15 Трылер «Адплата» (18+).**
**23.15 Серыял «Страшныя казкі» (18+).**

## ВТБ

**6.05, 14.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**9.00, 22.50** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.00** «Гатуй як шэф» (16+).
**10.35** «Дурні і дарогі» (16+).
**11.05** «Нечаканы прынц» (12+).
**12.55** «Уральскія пельмені» (16+).
**16.00** Серыял «Вароніны» (12+).
**17.00** Серыял «Гранд» (16+).
**20.00** Серыял «Жонка алігарха» (16+).
**21.00** «Таксі-2» (12+).
**0.00** Серыял «Псіхалагіні» (16+).
**1.00** Серыял «Анжаліка» (16+).
**2.00** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**3.35** «Адна за ўсіх» (16+).
**4.45** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...»
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35** «Тры дні з жыцця Ганны Балейн. Арышт, суд і пакаранне смерцю». Дак. фільм [СЦ].
**8.20, 17.20, 23.00** Колер часу.
**8.35** Легенды сусветнага кіно.
**9.00, 2.40** «Першыя ў свеце».
**9.15, 20.45** «Сімфанічны раман». Серыял [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 00.55** ХХ стагоддзе.
**12.20** «Дні хірурга Мішкіна» [СЦ].
**13.30** «Абсалютны слых».
**14.15** Галівуд Краіны Саветаў.
**14.30** «Рассакрэчаная гісторыя» [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. Тэатр.
**15.20** Пернікавы домік [СЦ].
**15.50** «2 Вернік 2».
**16.35, 22.15** «Аптымісты». Серыял.
**17.30, 2.00** Піяністы XXI стагоддзя.
**18.35** Прыступкі цывілізацыі [СЦ].
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Адкрытая кніга [СЦ].
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.30** «Энігма. Валянцін Урупін».
**23.10** «Фотасферы». Серыял [СЦ].
**0.00** «Каханая імператара — Жазэфіна дэ Багарнэ». Дак. фільм [СЦ].

## Настальгія

**6.00** «Быў час» (18+).
**6.55, 9.40, 11.00, 15.40, 17.00, 20.40, 21.40, 23.00, 00.50, 2.50, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.10** Маст. фільм «Спаведзь палюбоўніцы» (18+).
**8.40** Канцэрт гурта «Пушкінг» (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**13.00** Маст. фільм «Паветраныя піраты» (16+).
**14.20** Канцэрт гурта «Пікнік» (12+).
**18.00** «Яловая субмарына» (16+).
**19.15** Маст. фільм «Цягнік да Брукліна» (18+).
**0.00** «СевАлогія» (18+).
**1.00** Маст. фільм «Алмазы шаха» (18+).

## EuroSport 1

**0.30, 12.30** Тэлечасопіс GolfTV Weekly (6+).
**1.00, 4.00, 8.00, 13.00, 18.00, 19.30** Трэкавы веласпорт. Чэмпіянат свету (16+).
**2.30, 3.00, 7.00** Горныя лыжы. ЧМ. Карціна-д'Ампецца. Мужчыны. Слалам-гігант (16+).
**6.00, 9.30** Тэлечасопіс «Зала славы» (16+).
**10.30** Тэлечасопіс. Алімпійскія гульні (16+).
**11.30, 16.30, 17.00, 23.35** Горныя лыжы. КМ. Ленцэрхайдэ. Жанчыны. Слалам-гігант (16+).
**14.30** Лёгкая атлетыка. Амстэрдамскі марафон (6+).
**15.30** Лёгкая атлетыка. Парыжскі марафон (6+).
**17.30** Веласпорт. «Тур Ламбардыі». Мужчыны (16+).
**19.25, 23.30** Навіны (16+).
**22.55** Тэлечасопіс «Пражэктар спорту» (16+).
**23.25** The Minute (16+).

## Кінакамедыя

**0.55** «Суседка» (16+).
**3.05** «Парналоджы, або Мілка, як ты» (18+).
**4.50** «Бандыткі» (16+).
**6.30** «Пакуль вяселле не разлучыць нас» (12+).
**8.40** «Эвалюцыя» (12+).
**10.30** «Даспехі Бога» (16+).
**12.10** «Хатняе відэа» (18+).
**13.55** «Ходзяць чуткі» (12+).
**15.45** «Мача і батан» (16+).
**17.45** «Асляплены жаданнямі» (16+).
**19.30** «Асаблівасці нацыянальнага палявання» (16+).
**21.20** «Ну што, прыехалі?» (12+)
**23.05** «Мая супербылая» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.10** «Ганна-дэтэктыў» (16+).
**9.10** «Улегцы» (12+).
**9.50** «Каралёк — птушачка пеўчая». Серыял (16+).
**11.30, 3.00** «Знакі лёсу» (16+).
**12.05, 18.00** «Сляпая» (16+).
**13.10, 19.10, 3.30** «Варажбітка» (16+).
**14.15** «Старац» (16+).
**14.55** «Містычныя гісторыі» (16+).
**16.00** «Пятая варта». Серыял (16+).
**20.25** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**23.10** «Космас. Подзвігі і хлусня». Дак. фільм (16+).
**0.00** «10 самых» (16+).
**0.30** «Адвакат д'ябла» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+)

## ТБ1000

**5.50, 6.30, 17.20, 18.05** Доктар Хаус (16+).
**7.20** Кіраванне гневам (12+).
**9.25** Мільянер паняволі (12+).
**11.10** Без тармазоў (16+).
**12.55** Клуб аматараў кніг і піragoў з бульбяных ачысткаў (18+).
**15.05** Сталёвыя магноліі (6+).
**19.00** Іспанская — англійская (12+).
**21.25** Прыкінься маёй жонкай (16+).
**23.30** Сэрцаед (16+).
**1.25** Мачаха (12+).
**3.25** Цуд (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Золушка (16+).
**6.55** Каралева (12+).
**8.30** Палі! (12+)
**10.20, 13.55** Пра што гавораць мужчыны (16+).
**12.05** Пра што яшчэ кажуць мужчыны (16+).
**15.40** Золушка (16+).
**17.20** Тры волаты і прынцэса Егіпта (6+).
**18.35** Тры волаты. Наследніца прастола (6+).
**20.10** Усё пра мужчын (16+).
**21.35** Напарнік (12+).
**23.10** Хлопец з нашых могілак (12+).
**0.40** Шчасце ў канверце (12+).
**2.20** Канікулы строгага рэжыму (12+).
**4.10** Чорная маланка (6+).

## National Geographic

**6.00, 6.20, 5.35** Гульні розуму (16+).
**6.40** Машыны: разабраць і прадаць (16+).
**7.35, 13.25, 14.15, 17.35** Аўта-SOS (16+).
**8.25** Ледзяная дарога (16+).
**9.15** Самыя лепшыя суперкары (16+).
**10.05** Каралі рыбалкі (16+).
**11.00, 12.40, 16.50** Дзікі тунец (16+).
**11.50** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**15.05** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**16.00, 21.50** Злавіць кантрабандыста (16+).
**18.25, 18.50** Фабрыка ежы (16+).
**19.15, 20.05** Расследаванне авіякатастроф (16+).
**21.00, 0.20, 3.20** Аляска: новае пакаленне (16+).
**22.40** Закінутыя гарады з Альбертам Лінам (16+).
**23.30** Падымаецца бура (16+).
**1.05** Непакорлівы востраў (16+).
**1.50** Ліхтугі за мяжой (16+).
**2.30** Ліхтугі за мяжой: злачынствы і пакаранне (16+).
**4.10** Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
**4.55** Навуковыя глупствы (16+).

## Discovery

**8.00, 10.15, 10.40, 13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 21.15, 21.40, 7.35** Як гэта ўладкавана? (16+)
**8.25, 11.10, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**9.20, 9.45, 20.20, 20.45** Склады: бітва ў Канадзе (16+).
**12.05** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**16.10** Прыгожае жыццё (12+).
**17.35** Касмічныя забойцы (16+).
**18.30, 18.55** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
**19.25, 4.27** Хуткія і гучныя (12+).
**23.05, 00.00, 00.55, 5.14, 6.01, 6.48** Залатая ліхаманка (16+).
**1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04** Бітва за нерухомасць (12+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

АГУЛЬНЫЯ СПРАВЫ

# ІНІЦЫЯТЫВЫ, ЯКІЯ АБ'ЯДНОЎВАЮЦЬ

## Парламенцкая моладзь Магілёва і Прыморскага краю абмеркавала надзённыя пытанні

**Відэаканферэнцыя стала адной з падзей фестывалю «Дні Рэспублікі Беларусь у Прыморскім краі». Пакуль афіцыйная магілёўская дэлегацыя прадстаўляла нашу краіну за 10 тысяч кіламетраў ад яе — у Прымор'і, актывісты маладзёжнага парламента пры Магілёўскім абласным Савеце дэпутатаў арганізавалі анлайн-сустрэчу са сваімі калегамі з Савета маладых дэпутатаў Прыморскага краю. У маладых парламентарыяў шмат агульнага, але ёсць і нюансы. Таму гаварылі ў тым ліку і пра мадэль пабудовы маладзёжных парламенцкіх арганізацый у Беларусі і Расіі, асаблівасці іх функцыянавання, паўнамоцтвы маладых парламентарыяў, ролю маладзёжнага парламента ў грамадска-палітычным жыцці.**





— Асабліва выразна наш парламент праявіў сябе ў канцы мінулага і ў пачатку гэтага года, напярэдадні шостага Усебеларускага народнага сходу, — падзяліўся напрацоўкамі **каардынатар маладзёжнага парламента пры Магілёўскім аблсавеце дэпутатаў, намеснік старшыні аблсавета Павел САВЕЛЬЕЎ.** — Дзве з паловай тысячы прадстаўнікоў розных сфер на гэтым форуме мелі магчымасць унесці свае прапановы ў план далейшага развіцця краіны на найбліжэйшыя пяць гадоў. Наш парламент таксама не застаўся ўбаку. Разам з БРСМ былі праведзены дыялогавыя пляцоўкі ва ўсіх раёнах Магілёўскай вобласці. Сабраныя падчас іх работы ініцыятывы былі агучаны на пленарным пасяджэнні з удзелам губернатара вобласці Леаніда Зайца. У рэзалюцыю пасяджэння ўвайшлі такія прапановы як стварэнне самастойнага органа дзяржкіравання, які будзе рэалізоўваць маладзёжную палітыку праз падраздзяленні мясцовых выканкамаў; распрацоўка рэспубліканскай праграмы «Моладзь Беларусі» на 2022—2025 гады; фінансаванне маладзёжных праектаў і праграм грамадскіх аб'яднанняў праз дзяржаўныя гранты на конкурснай аснове. Апошняя ініцыятыва, дарэчы, знайшла падтрымку ў Прэзідэнта. Ён пагадзіўся з тым, што ў Беларусі неабходна стварыць сістэму малых грантаў на падтрымку маладзёжных ініцыятыў.

Каардынатар маладзёжнага парламента назваў шэраг удалых ініцыятыў, якія атрымалася рэалізаваць. На адной з дыялогавых пляцовак прадстаўнікі маладзёжных субкультур звярнуліся нконт стварэння скейт-пляцоўкі ў Магілёве. Маладыя парламентарыі дэталёва прапрацавалі прапанову і агучылі вынікі на адной з сесій Магілёўскага гарсавета. Ініцыятыва была прынятая да ведама і знайшла фінансавую падтрымку. З рэалізацыяй праекта дапамаглі прадпрыемствы горада і мясцовыя бізнесмены. А заяўнікі паўдзельнічалі ў мантажы скейт-пляцоўкі ў гарадскім парку ў Падміколлі.

Маладзёжны парламент выступіў таксама суарганізатарам адкрытага гарадскога чэмпіянату па варкаўце, ініцыятарам якога стаў рух Workout Team. Вырашана праводзіць яго штогод у ліпені.

Свае прыклады паспяховага прымянення маладзёжных ідэй прывялі расійскія дэпутаты маладзёжнага парламента. Некалькі гадоў у Расіі існуе маладзёжная арганізацыя, якая змагаецца з экстрэмізмам у інтэрнэце.

— Гэта вельмі цікавы для нас вопыт, — лічыць **дэпутат маладзёжнага парламента пры Магілёўскім аблсавеце дэпутатаў Уладзіслаў КУЛАКЕВІЧ.** — Хацелася б як мага глыбей вывучыць яго. Для нас гэта вельмі актуальна.

Тэмамі для разгляду таксама сталі міжрэгіянальнае і міжнароднае маладзёжнае супрацоўніцтва, рэалізацыя сумесных ініцыятыў, інструменты па ўзмацненні фарміравання патрыятызму і грамадзянскасці сярод моладзі Расіі і Беларусі.

У Магілёве дыялог адбыўся на базе Беларуска-Расійскага ўніверсітэта. Да яго далучыліся старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына Раінчык і намеснік начальніка ўпраўлення па рабоце са сродкамі масавай інфармацыі і маладзёжнай палітыкі Магілёўскага аблвыканкама Таццяна Меншыкава.

Удзельнікі сустрэчы абмяняліся кантактамі і намецілі тэмы для будучых анлай-зносін.

Павел Савельеў лічыць, што такія сустрэчы даюць магчымасць зверыць гадзіннікі і абмяняцца вопытам.

— Вельмі важна, каб у эпоху так званых «новых культурных каштоўнасцяў» мы аб'ядналіся і канкрэтнымі прыкладамі залапілі іншых, — кажа Павел. — Сёння, на жаль, моладзь не заўсёды сур'ёзна ацэньвае абстаноўку і слаба разумее важнасць свайго непасрэднага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці краіны. І над гэтым трэба працаваць.

Па выніках анлайн-сустрэчы выпрацавана рэзалюцыя, дзе пазначаны вектары будучых сустрэч.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Паўла Савельева.**

# САД ДОБРЫХ СПРАЎ НА ДОБРУШСКАЙ ЗЯМЛІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

— Прыемна, што самі людзі праяўляюць ініцыятыву. Жыхары населеных пунктаў нашага раёна наводзяць парадак у вёсках, садзяць паркі і сады, будуюць дзіцячыя пляцоўкі. Прынамсі, на некаторыя з праектаў можна атрымаць фінансаванне, калі ўзяць удзел у абласным конкурсе мясцовых ініцыятыў, і жыхары нашага раёна сёння цікавяцца такой магчымасцю, — **галоўны спецыяліст Добрушскага раённага Савета дэпутатаў Марына ШУМІЛАВА** з задавальненнем расказвае аб актыўнасці вяскоўцаў. Кажа: пра тое, як жыхары нават самых сціплых па памерах і аддаленых населеных пунктаў пераажываюць за свае вёскі і імкнуцца нешта змяніць да лепшага, можна казаць шмат, але лепш убачыць! Не леначацца адправіцца ў глыбінку, каб натхніцца ідэямі.

Так, днямі за новую справу для роднага гарадскога пасёлка ўзяліся жыхары Цэрахоўкі, другога па велічыні населенага пункта раёна. Цэрахоўцы паставілі для сябе задачу аднавіць стары мясцовы стадыён. Некалі шырокія, пасыпаныя жвірам бегавыя дарожкі зараслі так, што відаць толькі сцежкі. На самім футбольным полі гуляць стала немагчыма, нават небяспечна, з-за купін і ям.

— Шмат хто з мясцовай моладзі імкнецца займацца спортам, — распавёў **намеснік старшыні Добрушскага райвыканкама Руслан СІКОРСКІ.** — Ды і заняткі па лёгкай атлетыцы, якія вядзе педагог дадатковай адукацыі Уладзімір Кулiненка, тут праходзяць рэгулярна. Таму не адгукнуцца на просьбу мясцовых жыхароў было немагчыма. Людзі прасілі дапамагчы з тэхнікай.

Каб добраўпарадкаваць стадыён, арганізавалі суботнік. На спартыўным аб'екце загадзя значную работу правялі супрацоўнікі Цэрахоўскага сельвыканкама: высеклі кусты, скасілі бур'ян. Валанцёры ж, якія адгукнуліся на ініцыятыву вяскоўцаў, прыбралі галлё і траву, размецілі абрысы 400-метровай бегавой дарожкі, каб бульдозер ці грэйдар змог зняць пласт зямлі, парослы травой.

— На жаль, так склалася, што ўласніка стадыён не мае, гэтая тэрыторыя адносіцца да зямель агульнага карыстання, — расплумачыла Марына Шумілава. — Утрымліваць на сваім балансе нярофільны актыў сельвыканкаму не дазваляе закон. Але выдаткаваць сродкі на набыццё фарбы для прывядзення ў парадак турнікоў і іншага спартыўнага абсталявання ёсць магчымасць. Пафарбаваць жа спортаб'екты вызваліся самі мясцовыя аматары спорту.

Арганізаваны на стадыёне суботнік — толькі пачатак работ па яго добраўпарадкаванні. Цяпер ідуць перагаворы з кіраўніком гаспадаркі «Цэрахоўка-Агра» аб выдзяленні тэхнікі. Для выраўноўвання футбольнага поля патрэбныя дыскатар і ўкатчык для ўтрамбоўкі зямлі. Але галоўнае, талакой узяўшыся за рашэнне хвалюючай праблемы, вясковыя актывісты не сумняваюцца ў тым, што стары стадыён зноў напоўніцца крыкамі балельшчыкаў і атмасферай гульняў.

Матывуюць не спыняцца на дасягнутым і настойліва ісці да сваёй мэты — зрабіць родны населены пункт яшчэ прыгажэйшым — і жыхары аграгарадка Леніна Добрушскага раёна. Іх ініцыятыва — адраджэнне знакавага для ўсіх тутэйшых вяскоўцаў месца: старога парку. У Леніне жыве звыш шасцісот чалавек, у тым ліку 130 дзяцей.

На тэрыторыі ў паўтара гектара мясцовыя актывісты пачалі наводзіць парадак яшчэ вясной. Цяпер жа талакой залажылі вялікі сад з яблынь і рабін. На суботнік выйшла больш за паўсотню чалавек.

— Саджанцы ў нас непростыя. Нават рабінкі сартавыя, не кажучы ўжо пра яблыні — іх прывезлі з гадавальніка, — распавяла **старшыня Ленінскага сельсавета Тамара БУЙКЕВІЧ.** — Удзячная людзям за спагадлівасць. Педагогі школы, напрыклад, у поўным складзе выйшлі, старшакласнікі падцягнуліся. Упэўненая, за гэтым паркам-садам калектыўна і дагляддаць будзем.

Жыхары аграгарадка Леніна закладваюць малады сад.



Між тым неацэнную дапамогу вяскоўцам у добраўпарадкаванні дадзенай тэрыторыі аказала ААТ «Завідаўскае». Дырэктар сельгаспрадпрыемства Таццяна Бялян прапанавала высадзіць 90 яблынь — столькі гадоў працуе гаспадарка, дарэчы, адна з самых паспяховых у раёне. Набыццё саджанцаў Таццяна Віктараўна ўзяла на сябе. Гаспадарка ў тым ліку аплаціла работы па выдаленні карчоў. Сваімі сіламі разраўнавалі тэрыторыю і пасеялі грэчку, каб «перабіць» злоснае пустазелле — канадскі клён.

Яблыні ў новым садзе высадзілі роўнымі радамі, каб уздоўж магла прайсці тэхніка для апрацоўкі глебы. Па перыметры пасаджана больш за тры дзясяткі бяроз і рабін. Хутка ў новым садзе з'явіцца альтанка на дванаццаць «квадратаў» — матэрыял для яе бязвыплатна выдзеліла прыватная арганізацыя, а яе выраб аплацяць за кошт сродкаў самаабкладання. Ужо налета вяскоўцы мяркуюць ажыццявіць новы праект добраўпарадкавання роднага аграгарадка — удыхнуць жыццё ў перасохлае возера, што побач з новым садам.

Жыхары Леніна не сумняваюцца: іх зямля багатая на добрыя справы, а людзі адгукнуцца на любыя карысныя ініцыятывы. Адчуваюць ленінцы і падтрымку сваёй актыўнасці ў раёне і вобласці. Нядаўна ў цэнтры населенага пункта пабудавалі сучасную гульнявую пляцоўку. Набыць яе стала магчыма дзякуючы перамозе ў абласным конкурсе сярод сельсаветаў і органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання па вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння. Чарговым падарункам для вяскоўцаў стане новая алея з туй, якая будзе закладзена ў цэнтры аграгарадка. Дрэўцы для яе перададзены ад усіх сельскіх Саветаў Добрушскага раёна, райцэнтра і вобласці.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Добрушскага раённага Савета дэпутатаў.**

МАЁМАСЦЬ

# ЗНІШЧЫЦЬ НЕЛЬГА ВЫКАРЫСТАЦЬ

## У Зэльвенскім раёне непатрэбным будынкам даюць шанц на другое жыццё

**Зруйнаваць калісьці ўзведзенае, а цяпер кінутае жыллё ці недароблены будынак, якіх хапае ў беларускіх вёсках, — здаецца, самы просты варыянт. Нават калі такая маёмасць не замінае, дык выгляд псуе і тэрыторыю займае, вось і стараюцца яе пахаваць. Аднак часта пад бульдозер ідуць моцныя будынкі, якія маглі б служыць яшчэ дзесяцігоддзямі. Толькі вось няма каму і за што іх даглядаць... Тым не менш некаторым шанцуе — у іх з'яўляюцца новыя гаспадары з цікавымі ідэямі выкарыстання плошчаў без разбурэння. З тым, як працуюць органы мясцовага самакіравання на Зэльвеншчыне і якія змены ў адпаведны закон прапануюць, разбіраліся дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце, наведваючы раён.**

### Не руйнаваць, а аддаваць

Уласнікаў сядзіб сельвыканкамы просяць падтрымліваць парадак на падворках або адмовіцца ад дома, калі нашчадкі не збіраюцца яго даглядаць.

— У 2019 годзе ў Сынкавіцкім сельсавеце Зэльвенскага раёна знеслі 23 домаўладанні, а летась — сем. Многія гаспадары адмовіліся ад спадчынных хат, і з іх згоды гаспадарчыя пабудовы пазносілі, а землі ўвялі ў севазварот, — расказаў **Пётр ТАЛАЙ, старшыня Сынкавіцкага сельскага Савета дэпутатаў.**



Цяпер у вёсках часта можна сустрэць такую карціну. Поле пачынаецца амаль побач з хатай, якую яшчэ дагледзаюць, бо суседскую сядзібу, што была нікому не патрэбная, ужо зааралі пад поле.

За паўтара года ў раёне былі складзены 1116 прадпісанняў і тры пратаколы. Знесена 193 пустыя і старыя дамы і ўцягнута ў сельгасабарот 36 гектараў зямлі. Яшчэ 147 дамоў, на якія ёсць адпаведныя дакументы, таксама можна руйнаваць. Пры гэтым некаторыя хаты разбіраюць нашчадкі, пасля таго як атрымліваюць прадпісанне, адзначыў **Дзяніс АЛЬШЭЎСКІ, старшыня Зэльвенскага райвыканкама.**

Адно з добрых пачынанняў — выкарыстанне непатрэбнай маёмасці. Замест руйнавання будынкаў ім знаходзяць прымяненне. Так, напрыклад, на базе маёмасці, што не выкарыстоўвалася і якую задарма перадалі для работы прыватнікам, рэалізоўваецца праект па вырошчванні шампіньёнаў. Па вясне тут запрацавалі дзве секцыі, плануецца адкрыць яшчэ шэсць.

— Мы шмат страчваем на тым, што загнаныя ў межы па распараджэнні маёмасцю, якую яшчэ можна выкарыстоўваць і аддаваць інвестару на нармальных умовах. Аднак кошт у адну базавую велічыню і пры гэтым вялізны ўзровень адказнасці, а таксама аўкцыёны не надта прываблівають людзей. Таму варта даць магчымасць распараджацца такой маёмасцю мясцовым Саветам, — прапануе старшыня райвыканкама.

### Хаты краязнаўства

Некаторыя будынкі ў раёне не зносяць, а прадаюць згодна з сёлетнім Указам № 116 «Аб адчужэнні жылых дамоў у сельскай мясцовасці і ўдасканаленні работы з пустымі дамамі». У вёсцы Сынкавічы, напрыклад, адзін дом прадалі з аўкцыёну. А яшчэ ў кожным з сямі сельсаветаў збіраюцца зрабіць з такіх дамоў па музеі сельскага побыту — гэткай своеасаблівай хаце краязнаўства, дзе будуць сабраныя рэчы былых гаспадароў разабраных сядзіб.

— Такім чынам мы захоўваем напамін пра культуру і традыцыі і нават саму памяць мінулага беларускай вёскі. Такія музеі ў будучыні могуць вырасці ў музеі вёсак, — ухваліў ініцыятыву **Валянцін СЕМЯНЯКА, старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце.**

Першы такі музей сёлета зрабілі ў вёсцы Ярнева — у хаце, пабудаванай яшчэ ў 1932-м. Папярэднімі яе гаспадарамі была сям'я з чатырма дзецьмі. Іх фотакарткі дагэтуль вісяць на сценах. Жывая цяпер толькі адна з дачок — Ніна Максімаўна Лях, якая падарыла хату сельсавету.



Унутранае старадаўняе ўбранства музея сельскага побыту, створанага ў звычайнай хаце.

Цяпер тут спалучаюцца рэчы былых гаспадароў і тыя, што знайшлі ў іншых хатах. Руская печ з ляжанкай, дзе і спалі, і грэліся, і лячыліся. Калыска, падвешаная пад столь. Дзяжа для хлеба, які пяклі штодзень. Калаўрот, каб прасці ніці ды потым ткаць з іх адзенне, старадаўні сяннік (матрац, напханы сенам)...

Вядома, не ўсім хатам так пашанцавала. У вёсцы Шулякі, напрыклад, з 2015 да 2018 года знеслі 12 пустых домаўладанняў. Штогод у раёне ўводзіцца ў севазварот да 30 гектараў зямлі, выслабанай з-пад зруйнаваных сядзіб.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# Дарогі — мясцовыя, клопат — агульны

## Добрая навіна для жыхароў Падзвінскага краю, якія не вельмі задаволеныя станам дарог, была днямі агучана падчас сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў



**Паводле слоў намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзіміра БЕЛАВУСА, урадам станоўча вырашана пытанне дадатковага выдзялення для Віцебшчыны да канца гэтага тыдня 7,6 мільёна рублёў (а ўсяго ў трэцім і чацвёртым кварталах — прыблізна 12,9 мільёна), якія можна будзе выдаткоўваць на бягучы рамонт мясцовых дарог. Іх у Падзвінні ўсяго 3842 агульнай працягласцю каля 15 тысяч кіламетраў. У тым ліку гравійных — больш чым пятая частка ад гэтай лічбы.**

Таксама на мясцовых аўтамабільных дарогах вобласці каля 860 маставых збудаванняў агульнай даўжынёй прыблізна 19 кіламетраў.

Уладзімір Белавус нагадаў, што летась, калі здавалі ў эксплуатацыю Полацкі пуцепровад каля Віцебскага аўтавакзала, кіраўнік дзяржавы падтрымаў рэалізацыю многіх планаў па паляпшэнні стану дарожнага палатна на тэрыторыі Віцебшчыны. Сярод рэспубліканскіх дарог, якія запланавана прывесці ў парадак у найбліжэйшыя гады, трэць — аб'екты Віцебшчыны, падкрэсліў віцэ-губернатар.

На працягу бягучай пяцігодкі ёсць намер зрабіць у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі дарогу Лепель — Полацк з будаўніцтвам абходу найстарэйшага горада краіны, узвядзеннем моста праз Заходнюю Дзвіну і рэканструкцыяй існуючага навапалацкага моста. Сёлета з рэспубліканскага бюджэту выдаткавалі 13 мільёнаў рублёў на работы на мосце ў Наваполацку.

Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь прапрацоўвае магчымасць супрацоўніцтва для правядзення такіх маштабных работ з кітайскімі банкамі.

Вельмі даўно на розных узроўнях улады Віцебшчыны казалі аб тым, што дарога з Віцебска ў Оршу патрабуе значнай мадэрнізацыі. І вось урэшце ёсць усё, каб гаварыць пра тое, што да канца пяцігодкі гэтая траса будзе з чатырма палосамі першай катэгорыі. Прэзідэнт падтрымаў і магчымасць стварэння аб'езду абласнога цэнтра.

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** нагадаў, што дарогі — частка транспартнай бяспекі ўсёй краіны. Яны шмат у чым фарміруюць магчымасці развіцця рэгіёнаў. Рэалізацыя адпаведнай дзяржаўнай праграмы ў мінулай пяцігодцы дазволіла палепшыць стан многіх дарог Віцебшчыны, але вельмі шмат работы наперадзе.

Калі Уладзімір Цярэнцьеў падчас відэаканферэнцыі пачуў скаргі кіраўнікоў раённых Саветаў наконт таго, што не хапае грошай на рамонтныя работы, ён параіў прааналізаваць сітуацыю і прыдумаць алгарытм вырашэння праблемы, якая існуе не першы год. Магчыма, недзе сэканоміць, прыцягнуць на дапамогу мясцовыя арганізацыі і прадпрыемствы, выхадцаў з раёна, якія не забываюць родны край...

Традыцыйна падчас «прамых ліній» дарожнае пытанне — адно з самых праблемных. Таму ўвага да згаданай тэмы і прыняцце канкрэтных мер па паляпшэнні сітуацыі павінны быць адным з галоўных прыярытэтаў у дзейнасці мясцовай улады. Адпаведную задачу шмат разоў агучваў старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў. Нямала прыкладаў, калі ён асабіста выязджаў на месца, указанае заяўнікамі, каб на свае вочы ўбачыць, наколькі ўсё сур'ёзна, і потым прыняць адэкватнае рашэнне, каб, калі людзі маюць рацыю, дапамагчы ім. Зразумела, што ад стану дарог залежыць многае, напрыклад, своечасовае прыбыццё без праблем «хуткай», аўтакрамы, паштовай машыны...

Згодна з дзяржаўнай праграмай «Дарогі Беларусі» на 2021—2025 гады, прадугледжваецца адрамантаваць каля 1,3 тысячы кіламетраў дарог (у тым ліку каля 25 км па новых тэхналогіях), прыблізна 140 пагонных метраў васьмі мастоў. Што датычыцца грошай, на рэалізацыю мерапрыемстваў дзяржпраграмы па Віцебскай вобласці запланавана выдаткаваць каля 374,6 мільёна рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Газета для выбарнікаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 14 кастрычніка 2021 года.

# ЖЫЦЬ У ЗГОДЗЕ З ЛЮДЗЬМІ

**Днямі спаўняецца 75 гадоў празаіку, паэту, публіцысту і перакладчыку Ганаду ЧАРКАЗЯНУ.**
**Нарадзіўся Ганад Бадрыевіч 18 кастрычніка 1946 года ў Арменіі. Па нацыянальнасці ён курд-езід. Там вучыўся ў школе, падлеткам надрукаваў свае першыя творы ў рэспубліканскай дзіцячай газеце. У ёй жа прадстаўнік вялікага працалюбівага роду Чарказянаў пачынаў свой працоўны шлях сярод такіх жа добрых і зычлівых людзей. Затым служба ў Савецкай Арміі. Зноў вучоба, работа будаўніком, якую сумяшчаў з творчай. І — пераезд на пастаяннае жыццё ў Беларусь, на радзіму каханай дзяўчыны Людмілы Хількевіч, якая стала яго жонкай, сяброўкай, дарадчыцай (1968). З таго часу Ганад Чарказян жыве ў Мінску.**

На беларускай зямлі прызнанне да яго як таленавітага паэта прыйшло ўжо з першымі публікацыямі на рускай і беларускай мовах. Заўважылі многія калегі, а найперш класікі Пятрусь Броўка, Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін: талент. Яны, між іншым, на многія гады сталі яго сябрамі. А перакладалі і перакладаюць Ганада Чарказяна Валянцін Тарас, Фёдар Яфімаў, Валерый Ліпневіч, Казімір Камейша, Глеб Артханаў, Барыс Крывялевіч... Адметна: самі таленавітыя, але вельмі розныя творцы, калі ўважліва чытаць іх пераклады, адзначаюць у паэзіі і прозе Ганада Чарказяна такую адметнасць, як імкненне гаварыць з чытачом пра чалавечую дабрыню ў жыцці людзей не толькі тых, сярод якіх жыве, а ўвогуле на планеце Зямля. І адзначыў бы, што людская дабрыня ў яго творчасці — як жыццядайная традыцыя ўсіх народаў (кепскіх народаў не бывае, бываюць асобныя кепскія людзі там ці тут) ці душэўная і духоўная патрэба, без якіх жыццё немагчымае.

А ўсё для кожнага пачынаецца, як сцвярджае Г. Чарказян, здавалася б, з простага: са штодзённай рэчаіснасці і тваіх дзеянняў у ёй. З той рэчаіснасці, такой блізкай нам, бо яна для кожнага, але такой складанай, бо калі схібіш, спасуеш, адыдзеш ад яе... Таму, ведаючы ўсе яго кнігі, выдадзеныя ў нас, заўважу: у творах Ганада Бадрыевіча — добрае асабістае паступова злучаецца з агульначалавечым. Так, прага яго лірычнага героя да дабрыні, яго жаданне дарыць яе людзям.

Вось верш «Дзень дабра» з кнігі «У обрыва» (2021) — пераклад на беларускую мову Казіміра Камейшы.

*Было вядома і да нас,*
*Што ў зла свой круг шырокі.*
*Усе баяліся яго —*
*І збаўцы, і прарокі.*
*Гублялі часам праз яго*
*І дабрыні вытокі...*

Спыняю цытаванне. Сапраўды, як трапна пазначана! Спрадвеку на зямлі сярод людзей побач з дабрынёй ідзе зло. Яно імкнецца знішчыць дабро, як святло, што азарае чалавечы шлях ад пакалення да пакалення і ў будучыню. І, напэўна, у жыцці кожнага з нас часам здараюцца сітуацыі, калі здаецца, што трапляеш у безвыходную сітуацыю; калі думаеш, што зло перамагае. Але як бы там ні было, а найчасцей знаходзяцца людзі, якія прыходзяць на дапамогу — знаёмыя і блізкія або «чужыя і далёкія». Зрэшты, так неаднойчы было і з самім пісьменнікам на розных яго жыццёвых дарогах, у тым ліку і на нашай зямлі. (Пра гэта чытайце, у прыватнасці, у яго кнізе публіцыстыкі і паэзіі «Дорога на Ушачи» (2020). Пра яе я падрабязна пісаў у «Сельской газете» № 38 ад 3.04.2021 г.

Увогуле ж і на нашай зямлі ў яго было шмат дарог. І не толькі на радзіму класікаў, пра што ён піша ў гэтай кнізе, але і па ўсёй Беларусі. Мне, напрыклад, успамінаецца расказ Ганада Бадрыевіча аб яго наведванні Хатыні, як толькі быў адкрыты комплекс, і вяртанні ў Мінск. Уражаны трагедыяй нашага народа, ён пайшоў дадому пешшу... Адзін. Але шлях няблізкі... Цямнела. Ужо недзе на паўдарогі каля яго спыніўся «Масквіч». Вадзіцель запрасіў да сябе: «Ноч, як жа адзін?» Сеў. Разгаварыліся. І гэтае адчуванне, што цябе аднаго тут, на зямлі, якая стала роднай, як і тая, што нарадзіла, ніхто не пакіне ў бядзе, назаўжды ўвайшло ў яго свядомасць. І зразумеў курд Чарказян, паступова адчуў, што Беларусь — яго другая маці. Пра гэта ён напіша ў сваіх творах неаднойчы. І калі ўжо я сказаў пра кнігу «Дарога на Ушачы», дык зноў вяртаюся да яе. У прыватнасці, таму, што, расказваючы ў ёй пра дабрыню сяброў-класікаў, пра яго дарогу на іх радзіму Ушаччыну, наогул згадваючы дабрыню людзей нашай зямлі, пісьменнік кажа і пра іншае. Пра горкае... Так, з таго часу, калі ён вяртаўся з Хатыні і калі незнаёмы чалавек не пакінуў яго ў адзіноце, чамусьці нямала што змянілася ў паводзінах некаторых людзей: не зважаюць на іншых, абражаюць Айчыну... Але чаму да нас прыйшло такое наноснае, якое імкнецца парушыць усё тое добрае, чым жылі папярэднікі, жывём мы?

Дадам: калі пісьменнік, яго творы ставяць такое пытанне — ёсць пра што задумацца. Зрэшты, такое пытанне ставіць само жыццё...

Але вернемся да верша, які я цытаваў. І што б ні было — у ім надзея і перакананне, што тое зло, і зло наогул, якое імкнулася і імкнецца панаваць над дабром, не пераможа. Бо:

*А зло...*
*Ды гэта той туман,*
*Што не збярэш у жмені.*
*І там, дзе болей*
*Дабрыні,*
*Там зла заўсёды меней.*

Увогуле, калі гаварыць коратка пра сэнс творчасці паэта, дык у яго — выразнае імкненне да дабрыні, спагады, дапамогі іншым. І калі ўжо так, Ганад Бадрыевіч сам заўсёды, калі трэба, дапамагаў і дапамагае людзям. Помніцца, у 1990-я, калі паўсюль усё пад апладысменты пэўных сіл марнавалася і прысвойвалася імі ўсё агульнанароднае, калі і ў літаратуры было няпроста, ён, працуючы ў выдавецтве і займаючыся распаўсюджваннем кніг беларускіх пісьменнікаў, рабіў усё, каб нашы творы даходзілі да чытача. (Тады некаторыя выпадковыя людзі, якія былі там, патрабавалі, каб самі пісьменнікі збіралі тыражы, замест таго каб пісаць...)

І зноў пра зло, якое яшчэ нядаўна рабіла спробы панаваць на зямлі нашай Айчыны:

*Цягучы, слізкі ён, туман,*
*Ды і яшчэ няўлоўны.*
*Усюды, дзе дабра няма,*
*Там самы ён галоўны.*
*Ці мала свят у нас было,*
*Вы ведаеце самі.*
*А ўсё ж святкуем, злу на зло,*
*Дзень дабрыні мы з вамі...*

Творчасць Ганада Чарказяна ахоплівае самыя розныя бакі чалавечага жыцця. Для гэтага пісьменніка ў рэчаіснасці няма нічога другаснага, бо ўсё, што адбываецца з намі, — або асабістае, або пад уздзеяннем учынкаў і паводзін іншых людзей. І калі тваё суадносіцца з людскім, а людское — з тваім, то, на думку творцы, трэба быць не проста абачлівымі ў сваіх паводзінах, а рабіць усё абдумана, каб не разбіваць тую прыродную дабрыню, якая закладзена ў цябе ад нараджэння. А яна, калі ты слабы, можа зачахнуць у варунках жыцця, а на яе месцы з'явіцца зло. Вось як, напрыклад, пра гэта сказана ў анатацыі да яго кнігі «У обрыва», у якую ўвайшлі вершы, напісаныя за апошнія два гады. «Вока ў паэта вострае, ды яшчэ падмацаванае мудрасцю продкаў і сваім уласным вопытам. Вось і спрабуе ён сваім удумлівым, па-філасофску ўважлівым позіркам зазірнуць у самую глыбіню падзей, рэчаў і з'яў, нават развязаць тыя складаныя вузлы супярэчлівасці і безвыходнасці, што часта завязваюць нам час ды жыццё». І далей: «Толькі на вагах дабрыні ўзважвае аўтар усё перажытае ім самім і ўсімі людзьмі свету». І гэта сапраўды так: для пісьменніка Ганада Чарказяна, жыццё і лёс якога цесна звязаныя з нашай зямлёй, яе самымі рознымі людзьмі — ад класікаў літаратуры і да творцаў-пачаткоўцаў, ад навукоўцаў да хлебаробаў (пра гэта ў яго напісана шмат), важна, які ён сам сярод людзей. А ён піша для іх, і людзі паўсюль чытаюць яго. У Беларусі, Расіі, Арменіі, іншых краінах свету... Таму што таленавіта. Таму што, як прызнаецца ў адным са сваіх вершаў, ніколі не імкнуўся прысвойваць чужое, а ўсё, што яму «дадзена Богам» ад нараджэння і што не страціў у жыцці, «у рукі людскія» аддае.

Выдатнаму чалавеку, таленавітаму творцу Ганаду Бадрыевічу Чарказяну жадаю моцнага здароўя, творчых поспехаў. І як таварыш нагадваю, што рана падсумоўваць створанае: сапраўдны талент — дар нязгасны і невычэрпны. Чакаем новых твораў!

**Уладзімір САЛАМАХА,**
**лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.**

Новыя кнігі

# СНЕЖАНЬ ПАГУЛЯЦЬ РАШЫЎ У СНЕЖКІ

**Падарунак да Новага года юным чытачам краіны зрабіў Выдавецкі дом «Звязда», выдаўшы новую кнігу вядомага беларускага паэта Міколы ЧАРНЯЎСКАГА «Жыў на свеце дзядзька Тыдзень..: вясёлы каляндар».**




«Жыў на свеце дзядзька Тыдзень, / Працаваць любіў і ўмеў. / Трох сыноў меў дзядзька Тыдзень / І дачок чацвёра меў...» Дружная сямейка героя, прыдуманага дзякуючы творчай фантазіі дзіцячага паэта, вядзе традыцыйнае, але поўнае прыгод і забаў жыццё. Праграму яму задае звычайны каляндар. Таму следам за Тыднем у кнігу ўваходзяць і Месяцы, кожны з якіх займае сваё адметнае месца ў календары.

